№ 8 (654) 24 лютага 2010 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**На МАЗе скароцяць восем тысяч супрацоўнікаў?**

Старонка 4



**«Мы робім з алімпійцаў герояў. Прыемна, калі яны і ёсць такімі»**

Старонка 13



**Генерал знік**

Старонка 8

# Rammstein! Стой! Раз-два!

«Яны будуць крышыць яшчэ вельмі кволую беларускую самасвядомасць, таптаць памяць пра Перамогу і разбураць беларускую дзяржаўнасць».

Мінкультуры падтрымала патрабаванне старшыні Грамадскай рады па маральнасці Мікалая Чаргінца зладзіць папярэдні прагляд канцэртнай праграмы гурту «Рамштайн». Гурт мае выступіць у «Мінск-Арэне» 7 сакавіка. СМІ і байнэт адказалі кпінамі.

«Я разумею, што ўжо прададзены білеты на канцэрт у Мінску. Таму трэба зрабіць папярэдні прагон праграмы, узгадніць яе, каб не было прапаганды амаральнасці і гвалту на мінскай сцэне», — заявіў Чаргінец. 19 лютага Грамадская рада па маральнасці разгледзела пытанне аб правядзенні 7 сакавіка ў Мінску канцэрта гурту Rammstein. З гэтай нагоды была распаўсюджана заява, у якой нямецкія музыкі абвінавачваюцца ў прапагандзе нацызму і распусты.

«Што гэты гурт будзе рабіць у Беларусі?» — ставіцца пытанне ў заяве. І даецца адказ: «Яны будуць крышыць і знішчаць яшчэ вельмі кволую беларускую самасвядомасць, таптаць памяць пра Перамогу і яе герояў і, нарэшце, разбураць беларускую дзяржаўнасць. Менавіта так: беларускую ідэнтычнасць і ядро беларускай дзяржаўнасці 7 сакавіка збіраюцца ўзламаць пры дапамозе тарана... Рашэнне везці ў Мінск «Рамштайн» — гэта памылка, якая можа нам дорага каштаваць».

Заява Чаргінца імгненна ўзняла хвалю ў байнэце. Загучалі прапановы зладзіць перформанс са спальваннем адной з кніг былога сенатара (перасыпанай эратычнымі сцэнамі), выказваліся дасціпныя здагадкі наконт матываў такой заявы — маўляў, Чаргінцу не далі квітка на канцэрт. Былі і больш сур'ёзныя развагі, з якімі складана не пагадзіцца. Творчасць насамрэч эпатажнага нямецкага гурту цяпер ужо дакладна прыцягне ўвагу тых, за каго так непакоіцца старшыня рады — падлеткаў.

«Згадкі ў СМІ пра парнаграфічныя сцэны ў відэаролiках, пра распусту і г.д., толькі прыцягнуць увагу маладых людзей, у якіх, натуральна, не хопіць грошай, каб пайсці на канцэрт, дзе ўсяго гэтага акурат і не будзе. А цяпер вось, дзякуючы генералу, яны могуць залезці ў сеціва і бескантрольна пабачыць тыя самыя забароненыя сцэны», — піша ў каментарах да паведамлення пра заяву Чаргінца адна чытачка. Непакояцца каментатары на сайтах і за рэпутацыю краіны: калі канцэрт немцаў сарвецца, то ў Беларусь не хутка пачнуць прыязджаць зоркі сусветнага маштабу. Увогуле, калі падсумаваць агульны настрой каментатараў, дзеянні Мікалая Чаргінца ў дачыненні да нямецкіх зорак расцэньваюцца, як кемлівасць савецкага прапаршчыка з анекдота, якому загадалі спыніць цягнік («Цягнік! Стой! Раз-два!»).

**Працяг на старонцы 6.**



**Лявон Вольскі:**

**Rammstein мусіць сыграць для Чаргінца**

Старонка 6.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Дзядзьку Рыгору — 75

24 лютага народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін сустрэне свой юбілей у шпіталі.

Дзядзька Рыгор — так паважліва называе народнага паэта Беларусі моладзь — ляжыць у рэанімацыі бальніцы Кіраўніцтва справаў прэзідэнта з двухбаковай пнеўманіяй.

Барадулін патрапіў у рэанімацыю 14 лютага. Тэмпература цела даходзіла да 40 градусаў. Літаральна за пару дзён да гэтага ён выпісаўся з кардыялагічнага аддзялення 10-й клінічнай бальніцы Мінска.

Галоўны лекар лечкамісіі Ірына Абельская сказала, што паэт трапіў у шпіталь у дастаткова цяжкім стане, таму яго змясцілі ў аддзяленне рэанімацыі. Абельская паведаміла, што пацыент атрымлівае ўсё неабходнае лячэнне, і выказала надзею, што ўсё будзе добра.

«Я кожны дзень хаджу да яго ў бальніцу. Настрой у яго быццам бы неблагі. Але значных паляпшэнняў няма», — кажа жонка паэта Валянціна.

**Кастусь Матушыч**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

## У НУМАРЫ

**Чыноўнік Герашчанка: Пасля публікацыі кіраўніцтва параіла мне звольніцца**

Публікацыя «НН» мела вынік. **Старонка 5.**

## Стартавала кампанія па рэстаўрацыі Навагрудскага замка

З ініцыятывы Міністэрства культуры пачынаецца агульнанацыянальная кампанія па рэстаўрацыі аднаго з найважнейшых помнікаў Беларусі — Навагрудскага замка. Тут — калыска беларускай дзяржаўнасці. Тут каранавалі Міндоўга.

Прадугледжаны збор сродкаў шляхам пералічэння з бюджэту, правядзенне тыражоў латарэі «Скарбніца», а для прыватных ці карпаратыўных ахвяраванняў адкрыты пазабюджэтны рахунак.

Розыгрыш прызавога фонду латарэі «Скарбніца»: 22 красавіка 2010 г.

Для збору ахвяраванняў:Разліковы рахунак аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама №3632000001310 у АСБ «Беларусбанк» код 698 г. Навагрудак, УНП 500031377 з адзнакай «На рэстаўрацыю Навагрудскага замка».



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Самыя вядомыя радкі

з вершаў Рыгора Барадуліна

НАВЕДВАЙЦЕ БАЦЬКОЎ, ПАКУЛЬ ЯНЫ ЖЫВЫЯ...

Наведвайце бацькоў,
пакуль яны жывыя,
Пакуль дымяцца коміны —
нагрэйцеся ў бацькоў.

Калі адчай вякоў
гайнёй ваўкоў завые,
Не трэба анікому ён,
сум ля сляпых слупкоў.

ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

БАЦЬКУ

Не выйшаў ты і ў гэты раз
Мяне спаткаць, паднесці рэчы...
Ля весніц толькі зноў твой вяз
Крануў галінамі за плечы.

Ты мне не падасі рукі,
Глядзіш у даль з-за шкла партрэта...
Ці бачыш, вырас сын які?
Скажы хоць слова для прывета.

МАТЫЛЁК

Лілею млявы плёс люляе,
З-пад злежаных аблок здалёк
Ляціць, віхлясты і бялявы,
Пялёстак лёгкі — матылёк.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Рыгор Барадулін і Ніна Шыдлоўская, каардынатарка кампаніі «Будзьма».

**Рыгор Барадулін**

Нар. 24 лютага 1935 на хутары Верасоўка на Ушаччыне. Скончыў філфак БДУ. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў, адзін з айцоў-заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронту, заснавальнік Беларускага ПЭН-цэнтра. Народны паэт Беларусі (1992). У 1995—1997 сябра кіраўніцтва Беларускага Фонду Сораса. Сустаршыня Усебеларускага з'езда за незалежнасць (2000).

Друкуецца з 1953. Усяго выдаў каля 70 кніжак. Вершы, гумар, пераклады, эсэ. Вершы перакладзены больш як на 30 моваў.

Дзіцячыя пацешкі — і філасофскія вершы. Табуяваныя прыпеўкі — і ўзнёслая духоўная лірыка. І нават музычныя праекты з Вайцюшкевічам і Камоцкім. Барадулін шматаблічны і парадаксальны ў сваёй творчасці. За кнігу духоўнай паэзіі «Ксты» ён быў намінаваны на Нобелеўскую прэмію ад Беларусі.

## Фенаменальная заглыбленасць у хараство мовы

Піша літаратуразнаўца **Арсень Ліс**.

Рыгор Барадулін — постаць з плеяды старэйшых беларускіх паэтаў, якую сёння годна рэпрэзентуюць Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Анатоль Вярцінскі, Васіль Зуёнак.

Менавіта прадстаўнікі гэтага пакалення, што прыйшло ў беларускую літаратуру ў 50-я гады XX ст., насуперак складанай эпосе, з яе прывіднай мэтай і ідэалагічным прэсінгам, здолелі плённа папрацаваць дзеля духоўнага ўзбагачэння і ўзвышэння свайго народа, вызначыліся адказным грамадзянскім слугаваннем беларускаму мастацкаму Слову.

У маштабе ўсёй айчыннай літаратуры праз творчасць Рыгора Барадуліна праходзіць, набываючы ўніверсальную сімвалічную форму, матыў мацi, матулі, Радзімы.

Фенаменальная заглыбленасць Рыгора Барадуліна ў сэнсавае багацце і гукавое хараство роднай мовы дзіўна азвалася ў паэтычнавобразнай сістэме творцы.

Радасна ўсведамляць, што Рыгор Барадулін, як і яго пагодкі ды з імі большасць прадстаўнікоў сярэдняга і малодшага пакалення беларускіх літаратараў, сёння шчыра падзяляе дэмакратычныя і нацыянальныя духоўныя каштоўнасці — суверэннасць, дзяржаўнасць беларускага народа, свабоду чалавечай асобы.

Ці не ёсць гэта зарука добрай будучыні не толькі літаратуры нашай?..

**Перадаць кветкі Барадуліну**

людзі збіраюцца ў сераду 24 лютага ў 17.30 ля ўваходу ў Лечкамісію з вуліцы Чырвонаармейскай. Наведваць паэта ў рэанімацыі няможна, таму перададуць толькі букеты і падарункі.

**Імша ў гонар Барадуліна**

адбудзецца ў Чырвоным касцёле Мінска 24 лютага а 19-й.

### СЦІСЛА

**Лукашэнка адказаў Качыньскаму**

Лукашэнка адказаў на пасланне прэзідэнта Польшчы і выказаў надзею, што між краінамі будзе адбывацца добрасуседскі дыялог. У сваім лісце да Лукашэнкі Качыньскі выказаў занепакоенасць ціскам на Саюз палякаў. Качыньскі звяртаў увагу на міжнародныя абавязкі Беларусі і на дамову паміж Польшчай і Беларуссю.

**Апошні тыдзень зімы — вільготны**

25 лютага чакаецца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў. Тэмпература паветра ўначы ў пятніцу, 26 лютага, будзе вагацца ад 0 да мінус 10 пры праясненнях. Днём — ад 2 градусаў марозу да 4 цяпла. У канцы тыдня атлантычны цыклон прынясе чарговую порцыю дажджу і мокрага снегу. На дарогах па-ранейшаму будзе слізка.

**На мяжы з Расіяй 15-кіламетровы затор**

На трасе Брэст—Масква стаяць, у асноўным, грузавікі. Паводле расійскіх мытнікаў, затор звязаны з выхаднымі ў Расіі (23 лютага там — святочны выходны дзень). З боку Расіі ў кірунку Беларусі чаргі няма.

**У Вільні будзе памятная табліца Багушэвічу**

Яе ўсталююць з дапамогай беларускай дзяржавы. У Вільні Францішак Багушэвіч жыў на вуліцы Коннай. У літоўскай сталіцы ўжо вісіць 10 беларускіх мемарыяльных шыльдаў.

**Заробак у студзені ўпаў на 8,5%**

Сярэдні заробак у студзені склаў 999 963 рублі (у снежні 2009 г. — 1 093 017 рублёў).

**СМ, ЛК, БЕЛТА**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252.

Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

Від аплаты | Дата | Сума

За газету "Наша Ніва"

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

Від аплаты | Дата | Сума

За газету "Наша Ніва"

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перавказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй

**падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю**

**Таццяне П., Валянціну Л., Галіне К., Сяргею Я., С.Ш., Г.Я., Т.К., Галіне Ж., С.А., А.Ф., Паўлу Ч., Марыі Б., Сяргею Я., Т.М., А.Б., В.А., Генадзю Ш., Фёдару П., Н.А., Г.Т., В.В., Ларысе К., Г.Б., Баляславу К., Яўгенію І., Івану Я., Міхаілу С., Л.С., Канстанціну Ж., А.І., Наталлі М., Віталю Р., М.З., Яўгенію К., Валерыю І., Але Р., Людміле Л., Андрэю Б., А.А., Івану М., А.С., Ю.Ч., В., Л.Ц., У.Б.** з Мінска.

# Санкцыі не абмяркоўваюцца, але зроблены крок назад

Беларускае пытанне стала тэмай абмеркавання кіраўнікамі еўрапейскіх дыпламатый.

Дзеянні беларускіх уладаў супраць Саюза палякаў Беларусі адкінулі назад адносіны між Еўрасаюзам і Беларуссю, заявіла ў панядзелак вярхоўная прадстаўніца Еўрасаюза па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан на прэс-канферэнцыі па выніках пасяджэння Рады міністраў замежных справаў ЕС.

Пытанне пра развіццё сітуацыі ў Беларусі стала адной з тэмаў абмеркавання кіраўнікамі еўрапейскіх дыпламатый.

«Гэтыя падзеі азначаюць крок назад у нашых адносінах», — падкрэсліла Эштан, якая пачынае сваю дзейнасць у якасці кіраўніцы дыпламатычнае службы ЕС. Яна звярнула ўвагу на тую адкрытасць, з якой Еўрасаюз заангажоўваў Беларусь апошнім часам.

У той жа час, зазначыла Эштан, Еўрасаюз не разглядае магчымасць аднаўлення санкцый у дачыненні да беларускага кіраўніцтва ў сувязі з іх дзеяннямі ў дачыненні да Саюза палякаў Беларусі. «Мы не абмяркоўвалі санкцыяў», — заявіла Эштан.

Кэтрын Эштан сказала, што спадзяецца сустрэцца з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым 25 лютага ў Кіеве на інаўгурацыі ўкраінскага прэзідэнта.



Тым часам 24—25 лютага адбудзецца мінісесія Еўрапарламента, прысвечаная Беларусі. Ад незалежнага грамадства ўдзел у ёй возьмуць лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч і старшыня непрызнанага Саюза палякаў Анжаліка Борысь.

Беларуская праблема вярнулася на парадак дня ЕС, пасля таго як беларускія ўлады ўзмацнілі націск на СПБ і незалежнае грамадства.

Мілінкевіч і Борысь будуць мець таксама нефармальныя сустрэчы ў выканаўчым органе ЕС, Еўракамісіі — на ўзроўні еўракамісара. Запланаваная сустрэча і са старшынёй Еўрапарламента Ежы Бузкам.

Аляксандр Мілінкевіч, экс-кандыдат у прэзідэнты і лаўрэат прэміі Еўрапарламента імя Сахарава, быў адным з творцаў канцэпцыі пашырэння сувязяў Еўропы з Беларуссю, нягледзячы на аўтарытарнасць рэжыму ў Мінску.

Гэты падыход даў плён у выглядзе адноснай лібералізацыі эканомікі і грамадскага жыцця Беларусі. Дзякуючы пашырэнню сувязяў з ЕС, Мінск аслабіў сваю залежнасць ад Масквы і заняў агульнаеўрапейскую пазіцыю ў пытанні Абхазіі і Асеціі. Аднак далейшае развіццё адносінаў зайшло ў тупік.

Эксперты канстатуюць захаванне манаполіі на ўладу ў Беларусі, працяг русіфікацыйнай палітыкі ў сферы нацыянальнай ідэнтычнасці і прывілеяваныя пазіцыі расійскага капіталу ў эканоміцы, умацаваныя Мытным саюзам.

Працяг ранейшае палітыкі ЕС пастаўлены пад сумнеў пад ціскам грамадскай думкі Польшчы. Яна настроеная рэзка крытычна пасля апошніх атак на Анжаліку Борысь.

Польшча, між тым, — галоўная натхняльніца беларускай палітыкі ЕС. Зрэшты, і іншыя ўплывовыя ў ЕС структуры не бачаць пераменаў у Беларусі. Хрысціянскія дэмакраты, з'яднаныя ў Еўрапейскую народную партыю, былі шакаваны нерэгістрацыяй Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Рада Еўропы так і не дачакалася адмены смяротнага пакарання ці хаця б увядзення мараторыя.

У такой сітуацыі ў сталіцы ЕС захацелі пачуць голас беларускай апазіцыі. Увядзенне эканамічных санкцый супраць Беларусі малаімаверна, хоць у Варшаве, у тым ліку ў польскім Сойме, пра іх загаварылі. Аднак агульнае стаўленне да Лукашэнкі на вачах мяняецца.

**Мікола Бугай**

## Першы візіт Януковіч здзейсніць у Брусэль, і толькі потым у Маскву

Візіт у Брусэль запланаваны на 1 сакавіка, і еўрапейскія лідэры ўжо пацвердзілі сваю згоду на сустрэчу з новым кіраўніком украінскай дзяржавы. Аднак афіцыйна аб паездцы Януковіча будзе абвешчана толькі пасля яго інаўгурацыі — да прывядзення Януковіча да прысягі ў Брусэлі не могуць называць яго паўнамоцным прэзідэнтам.

Візіт новага ўкраінскага прэзідэнта ў Маскву адбудзецца пасля паездкі ў Брусэль — у першай дэкадзе сакавіка.

**СГ**

## «У цэнтры ўвагі» па-беларуску

21 лютага ўсе выпускі навінаў на БТ былі на беларускай мове. Гэта было прымеркавана да Дня роднай мовы.

Па-беларуску выйшаў таксама і выніковы за тыдзень аналітычны выпуск «У цэнтры ўвагі». Гэтым разам асноўнай тэмай праграмы была сітуацыя вакол Дома польскага ў Івянцы, Алімпіяда ў Ванкуверы, а таксама «прэзідэнцкая лыжня».

Пры канцы перадачы вядучы Юры Гроераў зазначыў: «Я спадзяюся, што ў гэты дзень усе, незалежна ад нацыянальнасці, успомнілі родную мову і размаўлялі на ёй. Як мы з Вольгай (яшчэ адна вядучая Вольга Доўгая — «НН»)».

А вось на тэлеканалах АНТ і СТВ Дзень роднай мовы не заўважылі, іхнія навіны ішлі звыкла парасійску.

**Зміцер Панкавец**

## Мінск ставіць Мытны саюз пад пытанне

Казахстан падтрымаў пазіцыю Масквы.

Беларусь ставіць пад пытанне мэтазгоднасць існавання Мытнага саюза пры захаванні пошліны на нафту. Збіранне пошліны на расійскую нафту, якая пастаўляецца ў Беларусь, супярэчыць прынцыпам адзінай мытнай прасторы, заявіў намеснік дырэктара дэпартамента замежнаэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Антон Кудасаў. На яго думку, трэба правесці трохбаковыя перамовы, «якія павінны прывесці да зразумелай сістэмы экспарту нафты з Расіі ў Беларусь і Казахстан без збірання мытаў». Пры гэтым ён дадаў, што перамоўны працэс «будзе цяжкім». «Пытанне стаіць, ці гатовы ў Расіі мадыфікаваць сваю сістэму збірання рэнты з прыродных рэсурсаў», — растлумачыў Кудасаў.

У той жа час багаты на нафту Казахстан падтрымаў Маскву, запярэчыў Мінску ў пытанні паставак нафты ў межах Мытнага саюза. Казахстан выступае супраць перагляду раней прынятых дакументаў, заявіў 19 лютага казахскі прэм'ер-міністр Карым Масімаў. «Ніякіх рэвізій прынятых рашэнняў быць не павінна», — цытуе Масімава РІА «Новости».

Ён падкрэсліў, што прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў «даў вельмі дакладнае даручэнне: нам трэба вельмі дакладна тут трымаць сваю пазіцыю».

**Сяргей Гезгала; БелаПАН**

## Трусаў: Дыктант стане агульнанацыянальным, калі яго будзе пісаць прэзідэнт

Беларускі дыктант стане агульнанацыянальным у поўным сэнсе гэтага слова, калі яго будуць пісаць прэзідэнт і члены ўрада. Такое меркаванне выказаў старшыня «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» (ТБМ) Алег Трусаў пасля правядзення ў Чырвоным касцёле Мінска чарговага этапа ІІІ Агульнанацыянальнага беларускага дыктанта. Дыктант прымеркавалі да Міжнароднага дня роднай мовы, які быў заснаваны ЮНЕСКА і адзначаецца 21 лютага. Тэкст паводле твора Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» ў Чырвоным касцёле пісалі больш за 50 чалавек, у тым ліку паслы Украіны і Швецыі Ігар Ліхавы і Стэфан Эрыксан.

Адкрываючы акцыю, Алег Трусаў адзначыў, што дыктант праводзіцца ў многіх населеных пунктах розных краін. Напрыклад, летась яго пісалі ў Італіі і на шведскім востраве Готланд, у Варшаве і Празе, у Аўстраліі, Канадзе і ЗША. Гэтым разам 21 лютага дыктант праводзіўся ў Мінску, а 20 лютага — у горадзе Бярозаўка Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.

**БелаПАН**

## СЦІСЛА

### Распрацуюць закон аб альтэрнатыўнай службе

Такое даручэнне Лукашэнка даў, заслухаўшы даклад дзяржсакратара Рады бяспекі Леаніда Мальцава. Наяўнасць альтэрнатыўнай службы прадугледжвае 57-ы артыкул Канстытуцыі. Рашэнне Лукашэнкі прывіталі ініцыятары грамадзянскай кампаніі «За альтэрнатыўную грамадзянскую службу».

### Комік Крыжаноўскі зноў ідзе на выбары

Вядомы гумарыст Яўген Крыжаноўскі вылучаны кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарсавета ад Ліберальна-дэмакратычнай партыі.

### Міліцыя на перамовы не прыйшла

19 лютага праваабарончыя арганізацыі спрабавалі зладзіць у гасцініцы «Еўропа» круглы стол з прадстаўнікамі праваахоўчых органаў. Ніхто з сілавікоў на перамовы не прыйшоў. Затое былі прадстаўнікі Офіса АБСЕ і пасол Швецыі Стэфан Эрыксан.

### Мартынаў сустрэўся з Ахмадзінежадам

Ключавыя напрамкі беларуска-іранскага супрацоўніцтва былі абмеркаваны на сустрэчы ў Тэгеране міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Мартынава з прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран Махмудам Ахмадзінежадам.

### Мядзведзеў узнагародзіў беларускіх генералаў

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў узнагародзіў шэраг беларускіх военачальнікаў ордэнам Дружбы. Яны ўдастоены ўзнагароды «за вялікі ўнёсак у развіццё і ўмацаванне расійска-беларускага супрацоўніцтва». Ордэнам Дружбы ўзнагароджаны старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Сяргей Гурулёў, намеснік міністра абароны Юрый Меранцоў, намеснік начальніка Генштаба Узброеных Сіл — начальнік галоўнага аператыўнага ўпраўлення Уладзімір Сулімаў, намеснік камандуючага Сухапутнымі войскамі — начальнік упраўлення баявой падрыхтоўкі і падрыхтоўкі рэзерваў Валерый Хахлоў.

**ЗП**

# МАЗ — мінус восем тысяч інжынераў?

**Антыкрызісная праграма Мінскага аўтамабільнага завода можа зрабіць інжынераў і тэхнолагаў беспрацоўнымі. Рабочых пакуль што не чапаюць.**

Уцечка інфармацыі з МАЗа адбылася, дзякуючы публікацыі ў шматтыражцы «Аўтазаводзец». Дадатковую інфармацыю ў прэсу вынеслі самі рабочыя, якія прысутнічалі на інфармацыйных сходах на заводзе.

Выявілася, што памілаваны карупцыянер Аляксандр Бароўскі, які быў прызначаны генеральным дырэктарам МАЗа два з паловай месяцы таму, не змог кардынальна змяніць сітуацыю на прадпрыемстве. Цяпер чарга дайшла да радыкальнага антыкрызіснага плана. Кіраўніцтва завода гатова плюнуць на сацыяльныя абавязкі і падысці да справы з капіталістычнага пункту гледжання.

### Як будуць ратаваць МАЗ

Да якіх канкрэтных крокаў вырашана перайсці?

Самая неверагодная інфармацыя, каб ёй даць веры, — магчымае скарачэнне пяці тысяч супрацоўнікаў завода. Гэта перадусім можа закрануць інжынераў, тэхнолагаў і майстроў.

Андрэй К., намеснік начальніка аднаго з інжынерных аддзелаў, расказвае, што размовы пра пяць тысяч інжынераў, якіх звольняць, вяліся яшчэ месяц таму. Цяпер называюцца ўжо іншыя лічбы — да васьмі тысяч спецыялістаў.

Завод будзе працаваць па скарочаным графіку. Зрэшты, такія ўмовы былі і летась. Наступнае пытанне датычыцца заробкаў. У частцы рабочых прэмія будзе зменшаная, іншыя ж застануцца без яе ўвогуле.

Нарэшце, вырашана пазбавіцца ад сацыяльнай нагрузкі. На балансе завода знаходзяцца паліклініка, дамы адпачынку, дзіцячыя садкі, лагеры... Паведамляецца, што ў цяжкія часіны рамонт гэтых аб'ектаў будзе праводзіцца сіламі працаўнікоў прадпрыемства, а не фінансавацца з завадскога бюджэту.

Ашчаджаюць нават у драбязе — адмаўляюцца ад аўтобусаў, якія штодня прывозілі ў Мінск 700 іншагародніх працоўных.

Пры гэтым на сайце кампаніі, у раздзеле «Вакансіі», усё яшчэ змешчаная інфармацыя пра пошук новых інжынераў.

### Дыягназ — перавышэнне складскіх запасаў

Калі звярнуцца да фінансавых справаздач, сітуацыя на МАЗе зусім не катастрафічная. Прадпрыемства было акцыянаванае ў 2008 годзе, а ўжо ў 2009-м у спісе самых прыбытковых беларускіх ААТ заняло прэстыжнае другое месца. Яно мела $29,6 мільёна прыбытку і саступала першынство толькі «Нафтану».

А вось складскія запасы не вытрымліваюць ніякай крытыкі. На цяперашні момант назбіралася каля 3700 непрададзеных грузавых аўтамабіляў. Гэта больш за штомесячны аб'ём вытворчасці ў 5,5 разу! Выходзіць, паўгода завод можа не працаваць.

**Ягор Марціновіч**



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Антыкрызісны план МАЗа

Скарачэнне 5 тысяч супрацоўнікаў.

Скарочаны графік працы (16—17 працоўных дзён у месяц).

Скарачэнне заробкаў.

Адмова ад сацыяльных аб'ектаў: ведамасных паліклінікі, дзіцячых садоў і дамоў адпачынку.

Адмова ад цэнтралізаванай дастаўкі рабочых на працу.

# «Мы схільныя верыць вашай статыстыцы»

**Міжнародны валютны фонд даў чарговыя інструкцыі беларускаму ўраду і намёкам прапанаваў свае паслугі яшчэ на год.**

Місія МВФ гасцявала ў Беларусі два тыдні, правяраючы і ацэньваючы эканамічныя поспехі краіны. Пасля сканчэння чацвёртага, апошняга этапу рэвізіі кіраўнік місіі МВФ у Беларусі Крыс Джарвіс паставіў адзнаку «добра» і даў на развітанне яшчэ некалькі рэкамендацый беларускаму ўраду.

### Як кампенсаваць $2 мільярды?

Сусветныя фінансісты настойліва патрабуюць змяншэння аб'ёму крэдытавання дзяржаўных праграм і ўтрымання курса рубля.

«Заключанае нядаўна пагадненне з Расіяй аб цэнах на сырую нафту, якая ўвозіцца з РФ, пры адсутнасці якіх-небудзь кампенсацыйных мер, выкліча істотнае павелічэнне дэфіцыту рахунку бягучых аперацый і дэфіцыту бюджэту сектара органаў дзяржаўнага кіравання», — гаворыцца ў паведамленні для прэсы.

Міжнародны валютны фонд намякае, дзе варта шукаць кампенсацыю згубленым $2 мільярдам: можна арганізаваць яшчэ адзін крэдыт. Па яго варта звяртацца туды ж, у МВФ. Беларускія ўлады не супраць. Яны «выказалі зацікаўленасць» у працягу супрацоўніцтва.

### Не хапае толькі прыватызацыі

Год праграмы — дастатковы час для ацэнак. Сусветныя фінансісты радыя, што ўсе крытэрыі рэалізацыі праграмы былі выкананы. У іх няма скепсісу ў дачыненні да занадта вясёлкавых статыстычных лічбаў, атрыманых беларускім урадам. «Мы схільныя верыць вашай статыстыцы», — заявіў Крыс Джарвіс.

Сярод недахопаў беларускай эканамічнай палітыкі былі названыя марудныя тэмпы прыватызацыі, што запавольвала атрыманне інвестыцый. Беларусы надавалі абяцанняў выправіць прыкрую недарэчнасць у найбліжэйшы час.

Пытанне аб выдзяленні заключнага, пятага траншу крэдыту будзе разглежданае саветам дырэктараў МВФ да канца сакавіка. Няма сумневаў, што Беларусі будуць выдзеленыя апошнія $700 мільёнаў. Менавіта гэтай сумы не хапае, каб скончыць крэдытную праграму stand-by агульным аб'ёмам $3,53 мільярда.

**ЯМ**

**Лукашэнка запрасіў групу Rothschild ацаніць беларускія прадпрыемствы**

«Калі ў прынцыпе будзеце згодныя, то найбліжэйшым часам мы б маглі вызначыць 5—7 праектаў і прапрацаваць іх больш сур'ёзна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы не толькі хацелі б атрымаць дакладную ацэнку прадпрыемстваў, якія прыватызуюцца, але і хацелі б многаму павучыцца».

Кіраўнічы дырэктар групы Арыэль дэ Ротшыльд выказала падзяку за высокую ацэнку працы кампаніі, у тым ліку па ацэнцы актываў БПС–Банка. Яна адзначыла, што прадстаўнікі групы Rothschild сустракаліся з удзельнікамі беларускага ўрада, кіраўніцтвам Нацыянальнага банка, каб лепш зразумець намеры беларускага боку з фінансавага і эканамічнага пунктаў гледжання.

Заснаваная ў 1765 годзе, на сённяшні дзень група Rothschild — гэта прыватная незалежная кампанія. На працягу апошніх сямі гадоў група Rothschild займае першае месца па ліку кансультацый па здзелках зліцця і паглынання ў Еўропе.

# Не будуешся — развітаешся з зямлёй

На зямельных участках, выдзеленых без аўкцыёну, установяць гранічны тэрмін забудовы. Згодна з указам № 64 ад 6 лютага 2009 г. для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, зямельныя надзелы пад будаўніцтва выдзяляюцца па чарзе, без аўкцыёну. Паводле інфармацыі Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, у 2009 годзе такім чынам было выдзелена 14 тысяч зямельных надзелаў, але толькі 1400 уладальнікаў пачалі будаўніцтва.

Гранічным тэрмінам будаўніцтва маюць быць чатыры гады. Неасвоены ўчастак пасля гэтага тэрміну будзе забірацца.

Апроч таго, мяркуецца змяніць парадак кансервацыі аб'екта, які будуецца на зямельным надзеле. На думку Кузняцова, яе можна праводзіць толькі пасля «ўзвядзення дома да даху». Таксама прадугледжваецца надзяліць райвыканкамы паўнамоцтвамі па прыняцці рашэнняў аб выдзяленні ўчасткаў.

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### У Мінску пабудуюць новыя паркінгі

У Мінску зарэгістравана каля 650 тысяч адзінак транспарту. Пры гэтым гаражных кааператываў усяго 250, а паркінгаў — 5.

### Самыя дарагія брэнды свету — Wal-Mart, Google і Coca-Cola

Брытанскае агентства Brand Finance падлічыла кошты 200 самых дарагіх сусветных брэндаў. Першае месца займае сетка супермаркетаў Wal-Mart, чый брэнд быў ацэнены ў $41,4 млрд. З пятага месца на другое за год выбралася кампанія Google. Яе брэнд каштуе $36,2 млрд. Трэцяе месца за Coca-Cola ($34,8 млрд). Апроч іх, у дзясятцы лідэраў IBM, Microsoft, GE, Vodafone Telecoms, HSBC, HP і Toyota. Беларускіх брэндаў у спісе няма.

### Цэны на айчынныя лекі адпусцяць. Але абмяжуюць

Міністэрства эканомікі прыняло пастанову №26, якая рэгулюе цэны на лекі айчынных вытворцаў. Раней існавалі фіксаваныя кошты. Дзяржава з дакладнасцю да рубля вызначала, колькі мусіць каштаваць прэпарат. Замест фіксаваных цэнаў будуць усталяваныя новыя, максімальныя. Такім чынам, беларускія вытворцы атрымаюць выбар — ці то прадаваць тавар танней, ці выстаўляць самую дарагую дазволеную цану.

### Іх норавы

Каля 4 тысяч пілотаў нямецкай авіякампаніі Lufthansa аб'явілі чатырохдзённую забастоўку. Яны патрабуюць павышэння заробкаў. Адменена каля 3000 рэйсаў.

**ЯМ**

# Андрэй Герашчанка: Пасля публікацыі кіраўніцтва параіла мне звольніцца

**Публікацыя «НН» мела вынік. Партал расійскага Інстытута краін СНД «Материк»: «Беларускія ўлады і агалцелая прэса змовіліся супраць старшыні «Русского дома».**



Гісторыя віцебскага чыноўніка і старшыні суполкі «Русский дом» Андрэя Герашчанкі атрымала працяг. З'явілася інфармацыя, што аўтар інтэрв'ю парталу «Материк» можа быць звольнены з пасады кіраўніка аддзела па справах моладзі ў выканкаме. У Віцебскім гарвыканкаме «НН» сказалі, што «такі чалавек у нас працуе і што пра ягонае звальненне нічога не ведаем». Сам Герашчанка нам расказаў, што яго «выклікала да сябе кіраўніцтва і параіла напісаць заяву аб звальненні. Але я гэтага рабіць не стаў, бо не лічу, што я парушыў беларускае заканадаўства ні ў якім выпадку».

Андрэй Герашчанка кажа, што калі ён нешта парушыў, то на яго трэба падаваць у суд. «Калі ж гэтага няма, то няма і пра што размаўляць. Погляды могуць быць рознымі. Пра заходнерускую канцэпцыю не адзін я разважаў. Нават прэзідэнт наш казаў, што мы рускія «со знаком качества». Дарэчы, гутарку з нашым карэспандэнтам Герашчанка вёў на добрай беларускай мове. Ён заявіў, што ніколі не лічыў беларускую дзяржаву і мову неіснуючымі: «Таму я і размаўляю з вамі на гэтай мове. Я толькі казаў, што нашыя тры народы маюць адзіны рускі корань і таму яны вельмі блізкія адзін да аднаго. Але я нідзе і ніколі не сцвярджаў, што мы павінны ўвайсці ў склад Расіі».

Ён паскардзіўся на «напружанне, якое зараз узнікае, калі мяне спрабуюць тут з усіх старон, ну, каб я ледзьве не з'ехаў са сваёй краіны».

Па словах Герашчанкі, гутарка з кіраўніцтвам пра звальненне адбылася ў панядзелак 15 лютага (артыкул у «НН» быў апублікаваны 10 лютага, на інтэрнэт-старонцы газеты — 12 лютага).

Што будзе далей, чыноўнік не ведае.

Артыкул «Так і сумяшчаем», надрукаваны ў «НН» у №6, апавядаў пра інтэрв'ю начальніка аддзела па справах моладзі ў Віцебску, а таксама старшыні грамадскага аб'яднання «Русский дом» Андрэя Герашчанкі парталу расійскага Інстытута краін СНД. У той гутарцы чыноўнік заявіў сярод іншага, што Беларусь яму бачыцца як яшчэ адна расійская дзяржава, а беларуская мова штучна створана.

Сам «Материк» развіў цэлую тэорыю змовы вакол публікацыі ў «НН». У артыкуле «Охота на ведьм» в Витебске или литвинское мракобесие» за артыкулам паставілі магутных лабістаў (маецца на ўвазе кіраўнік Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў) і высокіх чыноўнікаў — вядома ж, таямнічага Уладзіміра Макея.

«Чтобы найти ответ необходимо присмотреться к такой существующей структуре, как Общественно-консультативный совет (ОКС) при Администрации президента РБ, который возглавляет глава этого ведомства Владимир Макей, считающийся в литвинских кругах идейно близким человеком. В этом свете вполне резонной представляется мысль о том, что упомянутая статья в «Нашай Ніве» носила заказной характер и была элементом спланированной русофобской акции. Дело в том, что в ОКС помимо целого ряда прозападных деятелей входит и такой откровенный литвинский мракобес и ненавистник всего русского как председатель т.н. «Таварыства беларускай мовы» Олег Трусов (его русское имя и русифицированная фамилия (по-белорусски «трус» — кролик) не должны вводить в заблуждение)».

Аўтары гэтага «аналізу» выводзяць ланцужок да лагічнага завяршэння: «Вопиющий случай с Андреем Геращенко со всей неприглядностью выявил полное перерождение нынешней белорусской верхушки в сторону русофобии и идейного коллаборационизма. И поэтому слова белорусского президента о его идейной близости с Виктором Ющенко уже не кажутся какой-то оговоркой».

Адсочваць лёс Герашчанкі паабяцаў і беларускі прарасійскі сайт «Империя».

**Сямён Печанко**

# Паўгода арышту Алегу Сургану

**Зняволенне і 2,5 мільёна штрафу — прысуд за супраціў міліцыі пасля вывешвання бел-чырвона-белага сцяга ў Віцебску.**

19 лютага ў Кастрычніцкім судзе Віцебска скончыўся разгляд крымінальнай справы супраць сябра аргкамітэта партыі Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя і суполкі «Маладая Беларусь» Алега Сургана.

Працэс над ім пачаўся яшчэ 1 лютага. Алега абвінавачвалі ў парушэнні артыкула 364 КК «Супраціў работнікам міліцыі». Справа ж была заведзеная яшчэ ў верасні, калі браты Тарас і Алег Сурганы вывесілі бел-чырвона-белы сцяг на прыпынку грамадскага транспарту ля Медуніверсітэта.

Міліцыянт Дудкевіч, што затрымліваў апазіцыянераў, заявіў, што Алег Сурган укусіў яго за палец. Самога ж Сургана прывезлі ў пастарунак усяго збітага. Спачатку складаўся пратакол за вывешванне сцяга, але потым ён быў перакваліфікаваны ў супраціў работніку міліцыі.

Следства доўжылася некалькі месяцаў. 27 студзеня міліцыя, разлаваная дзёрзкім учынкам Сяргея Каваленкі, што вывесіў сцяг на цэнтральнай ялінцы горада, змясціла Сургана ў следчы ізалятар.

Прадстаўнік абвінавачання запатрабаваў для Алега пакаранне ў выглядзе трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму. Суддзя Яўген Буруноў спыніўся на мякчэйшым пакаранні: паўгода арышту і 2,5 мільёна рублёў на карысць пацярпелага міліцыянта, якому была нанесена «рана пазногцевай фалангі».




**Алег Сурган са слядамі пабояў пасля затрымання.**

Два дзясяткі актывістаў у зале суда сустрэлі прысуд выгукамі «Ганьба». Сярод іх быў і старшыня аргкамітэта Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі Павал Севярынец.

«У Беларусі з'явіўся яшчэ адзін палітвязень, — кажа Севярынец. — У мінулым Сурган сапраўды сядзеў за крымінальныя артыкулы. Але гэты чалавек адкрыта казаў, што хоча сваёй дзейнасцю дзеля нацыі выкупіць грахі свайго мінулага».

Амаль адначасова з Алегам перад судом паўстаў і ягоны родны брат Тарас Сурган. Суддзя Святлана Варатынская прысудзіла яго да прэвентыўнага нагляду цягам года. У віну Тараса паставілі тое, што пасля турмы ён не стаў на шлях выпраўлення, а «звязаўся з апазіцыяй».

**Зміцер Панкавец**

# Андрэй Пачобут: Мой сын будзе партызанам

**Пакуль сябар апальнага Саюза палякаў сядзеў пад арыштам, жонка прывезла з раддома сына.**

Раніцай 20 лютага ў Гродне выйшлі на волю кіраўнікі апальнага Саюза палякаў Ігар Банцар, Мечыслаў Яскевіч і Андрэй Пачобут, якія адбывалі пакаранне ў выглядзе 5 сутак адміністрацыйнага арышту, нібыта за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі. Ігар Банцар трымаў галадоўку цягам усяго арышту. На волі мужчын сустракалі паплечнікі.

Так сталася, што ў час, калі Андрэй Пачобут быў пад арыштам, з раддома выйшла ягоная жонка. У яго акурат нарадзіўся сын. «Пра сына даведаўся яшчэ да затрымання, — кажа ён. — Да нас у саюз патэлефанаваў гэбіст і расказаў пра гэта. Слухаўку падняў Банцар, ад яго я і даведаўся». У сваім блогу Андрэй пасля вызвалення напіша: «Думаю, што Яраслаў вырасце няслабым партызанам :-). Таму што КГБ пачало за ім сачыць яшчэ да ягонага нараджэння».

Раніцай 15 лютага Пачобута знялі з папуткі ў раёне Іўя, заявіўшы, што ён падобны да чалавека ў вышуку. Мясцовыя міліцыянты адвезлі яго на мяжу са Шчучынскім раёнам, дзе перадалі тамтэйшым калегам. Шчучынскія міліцыянты давезлі яго да мяжы з Гродзенскім раёнам і ўжо гродзенскія міліцыянты прывезлі яго ў суд. Размовы з міліцыянтамі з розных райаддзелаў у часе таго ранішняга этапу з Іўя ў Гродна моцна ўразілі Пачобута.

«Няма ў міліцыі ранейшага запалу. Міліцыянты кажуць, што ўсё разумеюць, што адчуваюць, на чыім баку праўда, але — у іх загад». Пачобут кажа, што супрацоўнікі міліцыі ўвесь час скардзіліся на малыя заробкі, адабраныя льготы, казалі пра цякучку кадраў. Папулярнасць Лукашэнкі рэзка ўпала сярод міліцыі ў параўнанні з 2005 г., мяркуе Пачобут.

Бацька Пачобута прасіў турэмшчыкаў, каб яны адпусцілі сына забраць жонку з радзільні, але такога дазволу не далі.

Напрыканцы гутаркі Андрэй Пачобут падзякаваў сябрам, паплечнікам, калегам і ўсім неабыякавым людзям за падтрымку.

**СП**



17 лютага ў Гродне 60 чалавек маліліся ля сцен РУУС у знак салідарнасці з арыштаванымі чальцамі Саюза палякаў. Служыў малебен ксёндз Аляксандр Шэмет.

# Rammstein! Стой! Раз-два!

Працяг са старонкі 1

Прыйшлася па заяве Рады Чаргінца-Філарэта і сусветная прэса.

Аднак, нягледзячы на адназначна негатыўную зваротную рэакцыю, беларускае Міністэрства культуры вымушана было рэагаваць. Яно папрасіла арганізатараў канцэрта гурту Rammstein у Мінску паказаць матэрыялы канцэртнай праграмы. Тыя арганізатары запэўнілі, што ў выпадку вострай неабходнасці прагляду праграмы абмяркуюць варыянт паездкі прадстаўнікоў Беларусі ў Расію на адзін з канцэртаў гурту.

Грамадская рада па маральнасці была створаная ў 2009 годзе на прапанову Беларускай праваслаўнай царквы і Саюза пісьменнікаў Беларусі. Узначаліў яе Мікалай Чаргінец. У раду ўвайшлі прадстаўнікі вялікіх канфесій, якія дзейнічаюць у Беларусі. У яе шэрагах Мітрапаліт Філарэт, Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, кампазітар Ігар Лучанок і іншыя.

«Rammstein» — нямецкі гурт, які на свaёй скандальнасці робіць сабе рэкламу. У Нямеччыне апошні альбом гурту забаронена прадаваць у адкрытым доступе з этычных меркаванняў, з прычыны карцінкі на вокладцы. У ЗША ўдзельнікаў гурту арыштоўвалі, але за паводзіны па-за сцэнай, а не за канцэрты.

**Кастусь Матушыч, Сямён Печанко**



## Лявон Вольскі: Rammstein мусіць сыграць канцэрт для Чаргінца

Грамадская рада па маральнасці прапануе зрабіць папярэдні прагон праграмы вядомага нямецкага гурта Rammstein, узгадніць яе, «каб не было прапаганды амаральнасці і гвалту на мінскай сцэне». З такой ініцыятывай выступіў генерал Мікалай Чаргінец.

**Лявон Вольскі:** Па-мойму, усё лагічна. Якая дзяржава, такія і парадкі. Хаця, думаю, для Rammstein гэта было б вельмі цікава даць адмысловы канцэрт для камісіі Чаргінца. З гэтага ўсяго можна было б зрабіць добры піяр, скарыстаць у сваіх мэтах. Зняць кліп, як каманда грае на адмысловай сцэне, а перад імі сядзяць з сур'ёзнымі тварамі члены камісіі. Узяць абавязкова інтэрв'ю ў Мікалая Чаргінца. Праз шмат гадоў яны будуць успамінаць у сваіх мемуарах і інтэрв'ю пра такі канцэрт. Нічога падобнага ў іхнім жыцці дакладна не было і не будзе. А для ўладыкі Філарэта ўвогуле лепш не глядзець такое шоу.

**«НН»: А самі як ставіцеся да творчасці Rammstein?**

**ЛВ:** Я не магу назваць сябе вялікім прыхільнікам гэтага гурта. Гэта добрая art-каманда, якая ў нейкай ступені зрабіла сабе імя на правакацыях. Але групе, якая грае папулярную музыку, немагчыма без правакацый. З гэтага яны пачыналі, і працягваюць цяпер. Я сур'ёзна думаў, што канцэрт забароняць, бо на выступах Rammstein выкарыстоўваецца фаер-шоу, а ў нас такое не прынятае. Але вось знайшлі, як падысці з іншага боку.

**«НН»: Можа, таксама пойдзеце на канцэрт?**

**ЛВ:** У нас ёсць квіткі на вялікі фэст, што адбудзецца ў маі ў Нямеччыне. Там сярод іншых будзе і Rammstein. Думаю, што там гук будзе лепшы, дык чаго разменьвацца на «Мінск-Арэну».

**Запісаў Зміцер Панкавец**




## Замежныя цыгарэты пачалі аздабляць па-беларуску

У Беларусі з'явіліся цыгарэты, афармленыя па-беларуску. На пачку цыгарэт West па-наску зробленыя ўсе надпісы: выходныя звесткі, паказчыкі ўтрымання смолаў і г.д.

Паводле кіраўніка аддзела збыту кампаніі «Табак-Інвест» Мікалая Папандопалы, фірма вырашыла рабіць надпісы на пачках цыгарэт выключна па-беларуску. «Winston», «Monte Karlo», «Golden Geit» — усе цыгарэты будуць ужо надалей па-беларуску», — кажа Папандопала.




**А так афармляюць цыгарэты ў арабскіх краінах.**

Па-беларуску будуць аформленыя і астатнія цыгарэты, якія выпускае «Табак-Інвест».

**«Еўрарадыё»**

# Лаўрэат, самы настаяшчы

Упершыню ў Беларусі адбылося ўручэнне прэміі **«Лютая палітыка»** — узнагароды палітыкам і палітычным дзеячам, а таксама грамадскім і дзяржаўным установам за глупствы і адыёзныя ініцыятывы, якія яны ўчынілі ў 2009-м. Сярод лаўрэатаў — Мінабароны, Зянон Пазняк, Мікола Статкевіч, Лявон Баршчэўскі, Леанід Козік... Галоўны прыз, «Самы люты палітык года», так нікому і не дастаўся.

Лаўрэатаў «Лютай палітыкі» вызначала журы, у склад якога ўвайшлі палітолагі і журналісты, што вядуць блогі ў LiveJournal. Старшынёй журы выступіў палітолаг Юры Чавусаў.

Спярша журы пляжыла, выбачайце, узнагароджвала, палітыкаў. За найлепшы рэбрэндынг у намінацыі **«Пазыцыянуйся!»** была адзначаная Партыя камуністаў Беларуская, якая спрабуе прыхаваць сваё мінулае пад шыльдай «Справядлівы свет».

**«За вынас мозга сродкамі палітычнага аналізу»** быў адзначаны сябар БНФ Лявон Баршчэўскі. Былы старшыня партыі завяваў прыз за бліскучы параўнальны аналіз праграмных палажэнняў Аб'яднаных дэмакратычных сілаў і Беларускага незалежніцкага блока, а таксама за абвінавачанне сваёй роднай партыі ў калабаранцтве.

Прыз **«Запільнасць»** атрымаў лідэр КХП БНФ Зянон Пазняк. Палітык-эмігрант памайстэрску выкрыў спецыяльную аперацыю КДБ па правядзенні З'езду беларусаў свету. Канкурэнтамі КХП-БНФ у дадзенай намінацыі выступілі самі КХП-БНФ за асуджэнне акцыі «Бой падушкамі» падчас Дня вайсковай славы.

**«Акцыяй года»** быў прызнаны абяцаны пікет старшыні ФПБ Леаніда Козіка ў абарону адлічанай з юрыдычнага факультэта БДУ Таццяны Шапуцькі, які так і не адбыўся.

Не абмінула журы і эканамістаў. Яраслаў Раманчук і іншыя адзначаныя прызам **«За тонкі гумар і разнастайнасць думак»**. Эксперты ў студзені 2009 года прагназавалі праграм дэвальвацыі беларускага рубля, у выніку даляр будзе каштаваць 4 тысячы беларускіх рублёў, чаго, як мы ведаем, не адбылося.

Усім пераможцам быў падрыхтаваны прыз — фігурка з воску: бочка, з якой вызірае Дыяген. Атрымаць Васкавога Дыягена прыйшоў толькі адзін лаўрэат — палітык Алесь Міхалевіч. Яго ўзнагародзілі за выкарыстанне сацыяльных сетак у інтэрнэце для «лоўлі чалавечых душаў». Лаўрэат падзякаваў арганізатарам і заўважыў, што «ў Беларусі не хапае сцёбу з палітыкаў».

Галоўны прыз, які мусіў быць уручаны «самаму лютаму палітыку года», ніхто і не атрымаў. «Да гэтай намінацыі ніхто не дацягвае», — патлумачылі ініцыятары прэміі і паабяцалі ўручаць антыўзнагароды за глупствы ў палітыцы штогод.

**Лявон К**

## СЦІСЛА



### Апошняе перавышэнне хуткасці

У Мінску аўтамабіль «Хонда» ўрэзаўся ў бетонную агароджу Батанічнага сада. Гэта адбылося 17 лютага ў 2.00. 22-гадовы кіроўца проста неасцярожна ехаў і не паспеў выкруціць руль. Ён пераламаў сабе рукі і ногі, атрымаў страсенне мозга, але застаўся жывы. За 2009 год у Мінску з прычыны перавышэння хуткасці ў ДТЗ загінула 27 чалавек і 242 атрымалі раненні.

**БелаПАН**

## КРЫМІНАЛ

### Нажываліся на людскім горы

Кіраўнікоў Гомельскага абласнога паталагаанатамічнага бюро засудзілі за атрыманне хабару. Галоўны лекар атрымаў чатыры гады пазбаўлення волі, начальнік па медчасткі — тры. У апошнім слове на судзе галоўны лекар заявіў, што не вінаваты. Злачынствы ж учыняў начмед, а ён «стаў ахвярай аператыўнага эксперымента КДБ пры падтрымцы начмеда».

Работнікі морга падазраваліся ў тым, што прадавалі інфармацыю аб памерлых камерцыйным арганізацыям, якія аказваюць рытуальныя паслугі. Пахавальныя бюро часта апярэджвалі не толькі канкурэнтаў, але і дактароў, міліцыю. З гэтых бюро тэлефанавалі родным памерлага, якія яшчэ нічога не ведалі пра няшчасце, прапаноўваючы хутка і нядорага арганізаваць пахаванне. Пры гэтым яны ўключалі ў кошт паслуг выдаткі, затрачаныя на інфарматараў з морга.

### Трое бамжоў былі знойдзеныя мёртвымі

У Мінску за 20—21 лютага. Мяркуецца, ва ўсіх трох выпадках прычынай смерці сталі сардэчныя захворванні.

### Скралі вадакачку

18-метровая вежа абслугоўвала СПК «Маляцічы». Каштуе яна 24 мільёны рублёў. Жыхар Крычава з трыма саўдзельнікамі разрэзаў яе на часткі аўтагенам, каб прадаць на металалом у Расію. Але міліцыя знайшла злачынцаў у той самы дзень.

### Памёр у аўтобусе

Слесара мінскага аўтапарка №5 знайшлі мёртвым ноччу 21 лютага ў салоне аўтобуса, што стаяў на тэрыторыі прадпрыемства. Мужчына ляжаў на падлозе, падклаўшы пад галаву куртку.

### Жанчыну забіла кавалкам лёду

У Мінску на вуліцы Даўгабродскай 80-гадовую бабулю забіла кавалкам наледзі. Яна са сваімі сяброўкамі сядзела на лаўцы ля пад'езда, калі з даху абрынуўся лёд. Жанчына памерла на месцы. Гэта першы зарэгістраваны выпадак падзення ледзяшоў на людзей.

**СМ; БелаПАН, БЕЛТА**

## Загінуў магілёўскі аператар Белсата Вадзім Аршынскі



Трагедыя здарылася 18 лютага. Вадзім Аршынскі вяртаўся дамоў з чарговых здымак. Дом, у якім жыве сям'я Аршынскага, рамантуецца, таму над уваходамі ў пад'езды зробленыя драўляныя навесы. Акурат у той момант, калі В.Аршынскі ступіў пад навес, з даху на яго абрынулася сумесь будаўнічага друзу і зляжалага снегу.

Навес удару не вытрымаў і абрынуўся на журналіста. Будаўнікі выклікалі «хуткую», але было позна. З бальніцы жонцы Вадзіма патэлефанавалі з тэлефона мужа і паведамілі пра яго смерць.

Вадзіму Аршынскаму было 50 гадоў. Прафесійны аператар. Супрацоўнічаў з незалежнымі СМІ, у тым ліку з тэлеканалам «Белсат». У яго засталося двое сыноў.

**Сямён Печанко**

# Дэпутаты палаты ціха мацюкаюцца

Разумныя лідэры апазіцыі таксама прыкусілі губу. Піша **Барыс Тумар**.

У Еўранэст, магчыма, запросяць толькі дэлегатаў ад апазіцыі. Ад лукашыстаў не будзе нікога. Пра гэта стала вядома крыніцам у Брусэлі.

Рашэнне прадказальнае: каму ж падабаецца, калі вам плююць у твар. А беларуская адміністрацыя пару разоў плюнула сакавіта. З разлікам і дакладнасцю.

Дэпутаты палаты і іх дэлегаваныя са спецслужбаў памочнікі ціха мацюкаюцца. Яны ўжо паспелі вывучыць турыстычныя мапы Брусэля і купіць новыя гальштукі.

Самае цікавае для разумных лідэраў апазіцыі — магчымасць камунікаваць з лукашэнкаўцамі — сарвалася. Самае цікавае для другога эшалону лукашэнкаўцаў — магчымасць бяспечна кантактаваць з апазіцыяй — страчаная таксама.

А ў астатнім усё добра. Прыстойнасці захаваныя. Антынароднаму рэжыму далі належны адлуп за яго некіраванасць. Лідэры апазіцыі атрымаюць камандзіровачныя і магчымасць вучыцца майстэрству сядзення ў прэзідыумах.



Юлія Дарашкевіч

## Хлусня ў вялікіх пагонах

Яшчэ нядаўна міністр унутраных спраў Анатоль Куляшоў называў невядомых у цывільным, якія закрываюць лапамі аб'ектывы падчас вулічных акцый, «неўстаноўленымі асобамі».

І вось падчас Акцыі салідарнасці 16 лютага адзін з такіх «неўстаноўленых» назваўся прапаршчыкам Ігнацьевым і адабраў фотаапарат у журналісткі «НН» Юліі Дарашкевіч. А другі звінаваціў яе ў тым, што яна яго ўдарыла. І таксама назваўся міліцыянерам Віктарам Віктаравічам Восіпавым.

Пасля цэлы аўтобус затрыманых асобамі ў цывільным адвезлі ў Цэнтральны РУУС сталіцы.

Брыдка лавіць міністра на дзіцячай хлусні. Але здзіўляцца няма чаму: чыноўнік маніць у вочы грамадству, бо не падсправаздачны яму. А за свае дзеянні адказвае толькі перад вышэйшым начальнікам.

Як і прапаршчык Ігнацьеў з калегам вольныя ў сваіх дзеяннях, бо хлусіць іх міністр. І яшчэ сваёй хлуснёй прыкрывае іх.

І чыноўнікі цвёрда перакананыя, што дзяржаўнае — гэта іхняе, і таму, калі ты працуеш у дзяржаўным СМІ, то гэта ўжо твой выбар аддānасці гэтаму чыноўніку... І яшчэ многа ў іх дзіўных уяўленняў.

Парадаксальна, у гэтым работнікі дзяржапарату наследуюць звычаі самай антыдзяржаўнай часткі грамадства — злодзеяў, блатных. Для іх любы з па-за іх кола — не чалавек. Ашукаць яго — не грэх. І найменшае, што дазволена.

Сяргей Мікулевіч

**Фотакарэспандэнтку «НН» Юлію Дарашкевіч затрымалі**

16 лютага на Кастрычніцкай плошчы Мінска, дзе яна фатаграфавала падчас Акцыі салідарнасці. Яе затрымаў чалавек у цывільным, які прадставіўся «прапаршчык Ігнацьеў». Іншы чалавек у цывільным заявіў, нібыта Юлія Дарашкевіч ударыла яго. У яе забралі журналісцкае пасведчанне. Пасля гэтага Юлію Дарашкевіч адвезлі ў Цэнтральны РУУС, дзе апісалі рэчы і пратрымалі тры гадзіны. Пасля з яе ўзялі тлумачэнне і адпусцілі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Захараў і нацыянальны гонар

Пачуў раніцай у метро: «Чуў, што Захараў учора заявіў? Але ж і шлюха!» Піша **Сямён Печанко**.

Словы галоўнага трэнера зборнай Беларусі Міхаіла Захарава пра тое, што ён «вельмі хоча, каб Расія выйграла Алімпіяду», зачапілі многіх.

«На добры лад, любы галтрэн прагне ўзяць «золата». У Захарава мары іншага кшталту: каб перамог супернік. Фантасмагорыя нейкая...», — напісаў у каментарах на сайце nn.by чытач Dardan.

І сапраўды фантасмагорыя. Цяжка ўявіць, што тое самае сказаў бы пра нацыянальную зборную Галандыі галоўны трэнер Хідынк. І тым больш цяжка паверыць, што Міхаіл Захараў можа дачакацца сустрэчнай шчырасці з боку Вячаслава Быкава, якому ён так жадае ўдачы ў Ванкуверы. Такога б нават не сказаў пра Канаду Глен Хэнлан, калі быў на пасадзе галоўнага трэнера ў Беларусі.

**Трэнер беларусаў Захараў: «Вельмі хачу, каб Расія выйграла Алімпіяду»**

Галоўны трэнер зборнай Беларусі па хакеі Міхаіл Захараў пракаментаваў стартавы матч на Алімпіядзе ў Ванкуверы супраць Фінляндыі (1:5). «Якая задача стаіць перад зборнай Беларусі? Будзем старацца патрапіць у васьмёрку. Але пры гэтым у нас няма ні прэміяльных, ні іншых стымулаў… Што тычыцца зборнай Расіі, то там сабраныя наймацнейшыя на сёння хакеісты. Вельмі хачу, каб менавіта расіяне выйгралі гэтую Алімпіяду».

**sports.ru**

## Вільня належыць не толькі літоўцам

Міністр замежных спраў Літвы Аўдронюс Ажубаліс падчас сустрэчы са студэнтамі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільні заўважыў, што і літоўцы, і беларусы маюць правы лічыць гэты горад сваёй сталіцай.

«Я з маленства жыў у Вільні, гуляўся і біўся з дзецьмі розных нацыянальнасцяў — літоўцамі, беларусамі, расійцамі, палякамі, украінцамі, яўрэямі. Я лічу, Вільня належыць не толькі літоўцам, а ўсім названым народам», — заявіў Ажубаліс.

Дыскусія праходзіла ў рамках візіту ў Вільню дэлегацыі Скандынавіі, якая аказвае ЕГУ фінансавую дапамогу. Рада выдзеліла ЕГУ 300 тыс. еўра.

Вадзім Вілейта, БелаПАН

## Чаргінец напісаў кнігу пра планету Лукшэйм

Шматзначная палітычная алегорыя трапіла ў кнігу «Ілоты вар'яцтва». На гэты факт звяртае ўвагу **Наталка Бабіна**.

Я не прыхільніца пісьменніка Чаргінца, але згадваю тут ягоную кнігу дзеля цытаты са старонкі 426. З вуснаў іншапланетніка, аднаго з персанажаў кнігі, чытаем: «Слухайце, Мікалай Платонавіч, пазазямных цывілізацый многа. Усе яны, за выключэннем адной, жадаюць паступовага пашырэння сваіх ведаў, развіцця і ўдасканальвання дзеля аб'яднання цывілізацый. Але ёсць планета Лукшэйм, дзе жывуць істоты, якія з'яўляюцца спараджэннямі пекла. Усе яны складаюцца з атамаў зла, нянавісці і цемрашальства. Гэта ад іх сыходзяць такія заганы, як зайздрасць, подласць, і пад іх уплывам усё больш землян ператвараецца ў нягоднікаў, падхалімаў, паклёпнікаў — разбуральнікаў і



знішчальнікаў вашай цывілізацыі».

Такая цікавая назва планеты зла — Лукшэйм, адкуль яна ў кніжцы? Шчыра кажучы, першае і апошняе, што прыйшло ў галаву — гэта скарот ад двух прозвішчаў: «Лукашэнка—Шэйман». Цікавае і паходжанне слоўца ў назве кнігі — «ілоты». Так называлі земляробаў у старажытнай Спарце, якія былі напаўсвабоднымі, напаўрабамі.



# Гонар па сцягу

У Ванкуверы адбываецца чарговая сусветная панама, у якую разгалінавая крымінальная групоўка каторы раз уцягвае добрую палову чалавецтва. Піша **Уладзімір Надзеін**.

Караскаючыся адзін на аднаго, дзясяткі журналістаў прадзіраюцца з мікрафонамі да маладога чалавека, які прабег на лыжах, санках альбо каньках на сотую долю секунды хутчэй за іншага маладога чалавека. Няўлоўны адцінак часу, на працягу якога мы з вамі не заўсёды паспяваем міргнуць, аддзяляе вялікія грошы і аглушальную славу ад невядомасці, безграшоўя, а часам і ганьбы.

Спорт найвышэйшых дасягненняў — гэта не спорт. Гэта не радасць, не адпачынак. Не здароўе. Перад кожным чэмпіёнскім п'едэсталам ляжаць палаты знявечаных няўдачнікаў і нават секцыі могілак. Самы натуральны стан за п'едэсталам — безвыходная інваліднасць. Прафесіянальныя спартоўцы жывуць з кругласутачным болем у цягліцах. З вялікіх спартоўцаў рэдка выходзяць вялікія трэнеры. Ім не хапае сілы духу весці дзяцей на пакуты, якія цярпелі яны самі.

Спорт найвышэйшых дасягненняў — галоўны спажывец злачыннай фармакалогіі. Ні на хвіліну не сціхае вайна тайных наркатычных лабараторый. На думку пераважнай большасці спартоўцаў, больш развітыя краіны з'яўляюцца ўзорам адваротнай маралі, бо выкарыстоўваюць у злачынных мэтах сваю навуковую перавагу.

Спорт найвышэйшых дасягненняў рoсціць культ звышчалавека — а нацыям патрэбныя звычайныя здаровыя мужчыны і жанчыны.

Спорт найвышэйшых дасягненняў адцягвае сілы, сродкі і ўвагу грамадства ад рэальнага здароўя.

Алімпійскія гульні — гіганцкі бізнэс міжнароднай карпарацыі пад назовам Міжнародны алімпійскі камітэт. Тут тугім вузлом завязаныя інтарэсы будаўнічых, транспартных, турыстычных, відовішчных кампаній. Але галоўны зацікаўлены бок — бюракраты. Калі гульнявыя віды спорту кормяць сябе самі, то ўсё астатняе абузай вісіць на нацыянальных бюджэтах.

Масы ашалелых грамадзян добраслаўляюць чыноўны распіл уласных грошай пад звон алімпійскага золата.

А тым часам ціхія мільянеры з МАК множаць колькасць алімпійскіх дысцыплін. Вось і сёлета з Расіі, дзе палова радзільных дамоў не мае гарачай вады, паехалі ў Ванкувер штурхаць па лёдзе вялікія паліраваныя камяні.

Ёсць толькі адзін спосаб управіцца з усёй гэтай навалай. Трэба скончыць са спортам найвышэйшых дасягненняў як нахлебнікам бюджэту. На плячах дзяржаўнага скарбу варта пакінуць толькі тое, што наўпрост звязана са здароўем нацыі.

**Уладзімір Надзеін**

калумніст расійскага «Ежедневного журнала» Ej.ru.

# Генерал знік

**Нядаўні начальнік Упраўлення ўнутраных справаў Гродзенскай вобласці генерал Генадзь Хацько абвешчаны ў вышук. На тым тыдні ён выйшаў з дому і больш не паказваўся.**

Заяву ў міліцыю аб знікненні нядаўняга кіраўніка міліцыі па Гродзенскай вобласці занеслі ўстурбаваныя сваякі. Пікантнасці гэтай гісторыі дадае той факт, што незадоўга да знікнення на генерал-маёра міліцыі была заведзеная крымінальная справа. Яго абвінавачвалі ў парушэнні артыкула 424 часткa 3 («Злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі»). А гэта прадугледжвае да шасці гадоў зняволення з канфіскацыяй маёмасці.

Справу заводзіла Генеральная пракуратура, але потым расследаванне было перададзенае ў Гродзенскую абласную пракуратуру. Там сцвярджаюць, што на допыты генерал з'яўляўся спраўна. Нават падазрэнне не ўзнікала, што ён прападзе: які быў сэнс змяшчаць яго пад арышт?

Справа Генадзя Хацько закруцілася летам 2009 года. Тады Рада бяспекі сумесна з Камітэтам дзяржкантролю і КДБ зацікавілася катэджам генерала ў Лідскім раёне. Яшчэ гарачай заставалася тэма з «домікамі ў вёсцы» сярод кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных справаў (папаліся намеснікі міністра Навумава Аляксандр Шчурко і Віктар Філістовіч і іншыя высокія чыноўнікі). Як вынік, такія домікі пачалі вышукваць і ў рэгіёнах.

Паводле адной з версій, Генадзь Хацько сваё лецішча ацаніў і задэклараваў усяго на 5 тысяч даляраў. Вядома, за такія грошы нічога талковага пабудаваць ці купіць немагчыма. Дзяржкантроль выставіў генералу ў 40 разоў больш (200 тысяч «баксаў») і патрабаваў вярнуць іх дзяржаве.

Пра пабудову катэджа Хацько ў Гродне хадзілі легенды. Казалі, што ў будаўніцтве было задзейнічанае ці не ўсё абласное ўпраўленне міліцыі. А потым справа трапіла на асабісты кантроль у Мінск.

Генадзь Хацько ад пачатку расследавання адразу быў адхілены ад пасады начальніка Упраўлення унутраных спраў Гродзенскай вобласці. Афіцыйна паведамлялася, што ён знаходзіцца ў адпачынку ці мае праблемы са здароўем. Але ніхто дакладна не мог даць прагноз, чым жа скончыцца гэтая справа.

Яшчэ ў верасні Хацько вярнуўся на пасаду і быў пэўны, што яго прыгоды скончыліся і можна спакойна працягваць працу. Аднак нешта не склалася.

4 лістапада Лукашэнка ўжо афіцыйна адхіліў Хацько з пасады кіраўніка Гродзенскай абласной міліцыі. Прычым, звольнены ён быў «у сувязі са здзяйсненнем учынкаў, якія дыскрэдытуюць званне супрацоўніка органаў унутраных справаў» (падпункт 15 пункта 154 Палажэння аб праходжанні службы ў органах УС РБ).

Пра гэта, дарэчы, змаўчалі абсалютна ўсе дзяржаўныя СМІ. Толькі праз нейкі час інфармацыя з'явілася ў выданні «Вечерний Гродно».

Гродзенскі журналіст Андрэй Пачобут у сваім блогу загадзя спрагназаваў адстаўку не толькі Хацько, але і яго намесніка, начальніка ўпраўлення фінансаў і тылу падпалкоўніка Рудніка, і начальніка аўтагаспадаркі падпалкоўніка Радзікевіча. Прэтэнзіі да іх былі ў тым, што на будаўніцтве катэджа былі задзейнічаныя міліцыянеры і міліцэйская тэхніка.

У сваім інтэрнэт-дзённіку Андрэй Пачобут адзначае, што, сыходзячы з пасады, Генадзь Хацько напісаў у «Милицейский вестник» артыкул «Честь имею», дзе выклаў свае бачанне падзеяў вакол сумнавядомага катэджа. «Акцэнты былі расстаўлены ў артыкуле наступным чынам — «братва, не страляйце адзін аднаго». Вось толькі «Милицейский вестник» артыкул свайго былога шэфа не надрукаваў. Такая вось свабода слова ў пагонах», — пісаў А.Пачобут.

Таксама журналіст адзначае, што міліцыя Гродзенскай вобласці за час кіравання Хацько «згубіла «жоўтую майку» лідэра сярод абласных упраўленняў».



**Генадзь Хацько**

нар. у 1957 у в.Каўпакі Гродзенскага раёна. У сістэме МУС з 1978. Працаваў у цэнтралізаванай ахове мотаўзвода начной міліцыі. Участковы інспектар Ленінскага РАУС Гродна (1982—1988). Намеснік начальніка Гродзенскага РАУС (1989—1993). Начальнік Бераставіцкага РАУС (1993—1999), Кастрычніцкага РАУС Гродна (1999—2003). Ад 2003 — намеснік начальніка УУС Гродзенскай вобласці. Ад 2005 — начальнік УУС Гродзенскага аблвыканкама. Быў дэпутатам Гродзенскага аблсавета. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «правазнаўства».

Незадаволенасць працай генерала выказваў яшчэ былы міністр Уладзімір Навумаў. Справа датычылася сурагатнага алкаголю ў Ашмянах. Тады Навумаў на калегіі МУС абвясціў, што супраць Хацько і некаторых ягоных падначаленых прыменены дысцыплінарныя спагнанні.

На час кіравання Генадзя Хацько прыпала гучная палітычная справа — арышт ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі. Арыштаваных вінавацяць у падрыхтоўцы тэракта супраць былога старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі. Нібыта Аўтуховіч рыхтаваў замах на «губернатара» з гранатамётам.

Нядаўняя адстаўка Саўчанкі, дарэчы, таксама нейкім чынам можа быць звязаная са справай генерала. Кіраўнік вобласці ўвесь час заўзята абараняў Хацько.

Кажуць таксама, што пасля звальнення Хацько пачаў заглядаць у чарку. А таксама кляў мясцовага кіраўніка КДБ, што падставіў чалавека, вернага Лукашэнку.

**Зміцер Панкавец**

# Малаеў: КДБ перамог у барацьбе з МУС

**17 лютага ў Вярхоўным судзе быў абвешчаны вырак па «паляўнічай справе». Трое міліцэйскіх чыноў трапілі ў турму за рысь.**

Гэты працэс доўжыўся за зачыненымі дзвярыма ад 12 кастрычніка. Фігурантамі справы з'яўляліся былыя начальнік галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Віктар Ермакоў, начальнік УБКіЭЗ Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Малаеў, начальнік УБКіЭЗ СН УУС Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Баранаў і начальнік АБКіЭЗ Жлобінскага РАУС Леанід Мінянкоў.

Міліцыянтаў абвінавацілі ў перавышэнні службовых паўнамоцтваў (арт. 426 КК), а таксама ў незаконным паляванні (на еўрапейскую рысь, занесеную ў Чырвоную кнігу).

17 лютага Вярхоўны суд абвесціў вырак: Ермакову і Баранаву — па тры гады зняволення, Мінянкову — чатыры. Аляксандр Малаеў таксама быў прызнаны вінаватым, але яго адпусцілі на волю, згодна з законам аб амністыі.

Яшчэ летам Малаеў у адкрытым



відэазвароце да Аляксандра Лукашэнкі прасіў кіраўніка краіны «спыніць беззаконне, якое чыняць супрацоўнікі КДБ».

Паводле словаў Малаева, міліцыя выявіла шматлікія злачынствы, якія здзяйсняліся супрацоўнікамі КДБ. Найперш маецца на ўвазе хабар, шантаж, пагрозы грамадзянам, якія адмаўляюцца складаць ілжывыя даносы. За гэта, паводле словаў Малаева, кадэбісты і пачалі ім помсціць. Таксама міліцыянт успомніў пра нейкі фільм, што быў зняты «чэкістамі» і паказаны Лукашэнку.

«У выніку гэтай жахлівай хлусні быў вымушаны падаць у адстаўку міністр Уладзімір Навумаў, начальнік галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Віктар Ермакоў вызвалены ад пасады», — гаварыў А.Малаеў.

Чаму «паляўнічая справа» атрымала такі розгалас? Бо ў незалежныя СМІ, а таксама ў міжнародныя структуры звярнуліся сваякі арыштаваных. Раней у падобных выпадках сем'і прымалі за лепшае рашэнне адмоўчвацца.

Па вызваленні Малаеў зазначыў, што ўжо няма ніякай барацьбы паміж МУС і КДБ, бо «адзін з бакоў гэтае змаганне выйграў».

Цікава, што ў той самы дзень, калі Вярхоўны суд выносіў прысуд па «паляўнічай справе», міліцыя прыйшла зператрусам у рэдакцыю «Народнай волі». Іх цікавіла працоўнае месца журналісткі Марыны Коктыш.

«Рэха «паляўнічай справы», нарэшце, дакацілася. Пакрыўджаны экс-старшыня УКДБ Гомельскай вобласці (на момант пачатку гэтай справы) і цяперашні старшыня УКДБ Гродзенскай вобласці Іван Корж шукае тых, хто на яго ўзвёў паклёп. Дакладней, па яго заяве шукае міліцыя. Вусна гаварылася, што не спадабаліся Каржу артыкулы на сайтах «Хартыя-97» і «Беларускі партызан», але ў выніку канфіскавалі камп'ютар Марыны Коктыш», — напісала намесніца галоўнага рэдактара «Народнай волі» Святлана Калінкіна.

Такім чынам, «паляўнічая справа» можа атрымаць нечаканы працяг.

**ЗП**

Чаму «паляўнічая справа» атрымала такі розгалас? Бо ў незалежныя СМІ, а таксама ў міжнародныя структуры звярнуліся сваякі арыштаваных.



На хутары, як у чароўнай казцы.

# Музей ці сабачы вальер?

**На Валожыншчыне разгарэліся зямельныя спрэчкі паміж уласнікам хутара Алесем Ласём і Таварыствам паляўнічых.**

Алеся Лася складана назваць шараговым уладальнікам аграсядзібы на Валожыншчыне. Незвычайная асоба ў незвычайным антуражы — захапляльнае відовішча для турыстаў. І вось нярадасць чалавеку. Побач з ягонай аграсядзібай Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў (БТПР) плануе размясціць вальер для нагонкі сабак. Спадар Лось упэўнены — шкоднае суседства знішчыць атмасферу яго экалагічнай ідыліі, як, зрэшты, і ўвесь план па развіццю экатурызму.

## Музыка, мастак і прадпрымальнік

Алесь Лось паўжыцця адраджае народныя музычныя інструменты — дуды, колавыя ліры, жалейкі, бубны. Амаль дзесяць год жыцця ў Залессі на Смаргоншчыне творца прысвяціў батлейцы. Пры яго ўдзеле ў сядзібе Агінскіх была адкрытая школа мастацтва. «Гэта была першая школа ў Беларусі, створаная па аўтарскім праекце і падтрыманая Міністэрствамі культуры і адукацыі», — расказвае спадар Алесь.

Летась ён пераехаў са сталіцы на хутар Барок непадалёк ад вёскі Цішкоўшчына, што на Валожыншчыне. Надзел быў куплены яшчэ дзесяць гадоў таму, але толькі летась гаспадар перабраўся на сталае жытло. Мясціны надзвычай прыгожыя: пару кіламетраў убок ад трасы — і трапляеш у «цуд некранутай прыроды». Сярод лесу лукой выгінаецца рэчка Яршоўка, і каля яе вялікай восемкай прагаліна. У адным коле восемкі — поплаў у даліне, у другім — поле. На іх сутыку, на самым схіле высокай тэрасы над поплавам, стаіць хата. Ідэальныя ўмовы для творцы, каб сканцэнтравацца на мастацтве. Кажуць, раней-шы гаспадар хутара сябраваў з Якубам Коласам, і той не раз бываў тут у лазні. Тая лазня яшчэ стаіць, дарэчы.

Спадар Алесь лічыў, што знайшоў свой асабісты рай, займеў сядзібу, пра якую ўсё жыццё марыў, і нарэшце збудуе тут маленькую Беларусь свайго ідэалу. Каб атрымаць базіс, ён заняўся экатурызмам. Ён зарэгістраваў аграсядзібу і заняўся стварэннем інфраструктуры. Да драўлянай часткі дома пачаў прыбудоўваць каменную, дзе меламся б знаходзіцца творчая майстэрня, паставіў паветку для пленэраў, для абедаў, распрацаваў конны маршрут працягласцю 35 кіламетраў, разам з сынам Уладзімірам збудаваў кузню, дзе арганізаваў школу кавальства для ахвотных навучыцца сярэднявечным тэхналогіям коўкі... На лета запланаваў адкрыццё мінімузея народных інструментаў.

Алесь Лось падкрэслівае, што не ўзяў ад дзяржавы ні капейкі крэдыту — усё рабіў за ўласныя сродкі.

## Непрыемнае суседства

Непрыемнасці прыйшлі адтуль, адкуль іх ніяк не чакалі. Улетку 2009 года побач з надзелам Лася пачалося будаўніцтва вальера па нагонцы сабак. План Таварыства паляўнічых прадугледжваў, што ад людзей закрыюць лес плошчай 9 га. На гэтую плошчу навязуць янотаў, лісаў ды дзікоў. На іх і будуць трэніравацца штосуботу сабакі паляўнічых.

«Маладыя сабакі ўгрызаюцца ў дзіка. Пакуль у яго ёсць вушы і непарваны лыч, ён яшчэ змагаецца... Пасля, калі яго забіваюць, завозяць новага дзіка», — расказвае механізм працы вальера спадар Алесь. Яму катэгарычна не падабаецца ідэя будоўлі. Турысты наўрад ці захочуць слухаць брэх і перадсмяротныя крыкі жывёл у лясной цішы. Калі ж паляўнічыя вырашаць адзначыць сваю сустрэчу — а каля вальера якраз маюць пабудаваць гатэльчык, — то нецвярозыя святы таксама адпужаюць ад сядзібы Лася наведнікаў.

Выступілі супраць і жыхары Цішкоўшчыны — яны двойчы збіралі подпісы за адмену будаўніцтва. Але раённыя ўлады заявілі, што законных падстаў забараніць паляўнічым і рыбаловам будавацца няма.

Дазволу на будаўніцтва ў паляўнічых яшчэ не было, але яны ўжо ў жніўні 2009 года завезлі будматэрыялы. У дадатак паляўнічыя паспелі атрымаць штраф ад Валожынскага лясгаса за незаконную вырубку некалькіх дрэваў.

## У кожнага сваё разуменне міру

Старшыня Валожынскага раённага аддзялення БТПР Віталь Есьман, наадварот, усцешаны будучым суседствам. Ён мяркуе, што высілкі арганізатараў турызму можна аб'яднаць — маўляў, хай паляўнічыя ходзяць любавацца на музычныя інструменты! А наведнікі сядзібы Ласяа заадно змогуць паглядзець на дзікоў.

Алеся Лася такі мір не задавальняе. Ён наракае, што ў яго ў выніку прагарэў кантракт на будаўніцтва карчмы.

Таму ён мае сваё разуменне кампраміснага варыянту. «Я прапанаваў ім вярнуць грошы, якія яны паспелі патраціць на афармленне зямлі. Гэта пяць-шэсць мільёнаў рублёў, — расказвае мастак. — Для сабачнікаў можна знайсці іншае месца, каб не перашкаджаць маёй сядзібе». Тым больш што лясоў на Валожыншчыне хапіла б на ўсіх. Зразумела, што такая ідэя прыйшлася паляўнічым недаспадобы. Месца зручнае: і зацішнае, і над рэчкай, і ўсяго паўтара кіламетра ад трасы Мінск—Вільня.

## Дуды замест бульбы

Пакуль спадар Алесь змагаўся з паляўнічымі і мясцовымі ўладамі, на ягоны надзел зачасцілі камісіі дзеля праверак. Прысуды несуцяшальныя — «нямэтавае выкарыстанне зямлі». На думку сельсавета, ён запусціў сваю тэрыторыю. «Бульбы не садзіць, курэй не трымае», — пераказвае спадар Алесь прэтэнзіі старшыні. Аргументы, што сваёй унікальнай дзейнасцю ён прынясе нашмат больш карысці раёну, жанчынаю ўспрымаюцца слаба. Загучалі пагрозы, што Ласяа пазбавяць зямлі і ліцэнзіі на аграэкатурызм.

Бакі пакуль не даводзяць пытанне да суда. Хоць прынцыповасць удзельнікаў канфлікту не пакідае надзеі на кампраміснае рашэнне. За Таварыствам паляўнічых фактычна стаяць мясцовыя ўлады — старшыня Валожынскага райвыканкама Уладзімір Наўмовіч заяўляе, што не бачыць ніякага ўціску правоў мастака. Алесь Лось спадзяецца на вышэйшыя інстанцыі — Камітэт дзяржкантролю, Адміністрацыю прэзідэнта, але тыя вяртаюць пытанне на разгляд раённаму кіраўніцтву.

Такі вось адвечны канфлікт вольнага мастака і капіталістычнага грамадства ў абставінах XXI стагоддзя.

**Ягор Марціновіч**



**Алесь Лось распрацаваў конны маршрут па Валожыншчыне.**



**«Бульбы не садзіць, курэй не трымае, зямлю запусціў», — наракаюць у сельсавеце. А Алесь Лось хоча зрабіць са сваёй аграсядзібы жывы музей.**



**На хутар Барок прыязджаюць аматары этнічнай музыкі з усяго свету.**

## Як прымусіць махіну скукожыцца

Некаму сілком усунулі хабар, а пасля пасадзілі. **Некага пабілі ў міліцыі на допыце. Яшчэ хтосьці ўжо сам даваў хабар, каб адкупіцца ад «крыміналкі». Іншага прымусілі на працы напісаць заяву «па ўласным жаданні»... А на слыху толькі «палітычныя справы». Бо актывісты апазіцыі маюць смеласць гучна гаварыць пра перасislед. Астатнія ціха плацяць, сядзяць, сыходзяць з працы...**

Няправільна ацэньваць лукашызм як сістэму, пры якой асноўная большасць задаволеная. Большасць — дзіка запалоханая.

Кожны адчувае сябе самнасам з чынавенскай махінай. Толькі яна кукожыцца, калі натыкаецца на людскую салідарнасць або трапляе на святло. Калектыўны ліст настаўнікаў можа памагчы калегу застацца на працы. Артыкул у газеце пра здзекі на допыце — пацягнуць службовае расследаванне. Толькі важна зрабіць гэты першы крок — да публічнасці.

**Аляксандр Хіла, Маладзечна**

## Докшыцкія начальнікі рыхтуюцца прывітаць Януковіча?

**Віктар Януковіч за часамі, калі займаў пасаду прэм'ер-міністра Украіны, двойчы прыязджаў у вёску Янукі, што каля Ваўкалатаў у Докшыцкім раёне.** Тады за лічаныя дні прыйшлося наводзіць «паказуху» ўздоўж дарогі.



Як толькі сталі вядомыя вынікі выбараў на Украіне, рабочых докшыцкага камунгаса зноў адправілі ў бок вёскі Янукі — высякаць маладыя хмызнякі. На думку працаўнікоў, начальства загадзя рыхтуецца да магчымага візіту Януковіча.

**Янка Зуброўскі, Докшыцы**

## Не навязвайце «благословение»

**Надысь набыў я даўно ўпадабаны хлеб «Шчодры».** (Наша сям'я заўсёды выбірае беларускае, а гэты гатунак сапраўды смачны!) А ён надпісаны «по благословению Православной церкви»! Але згадзіцеся, навошта атэісту ці верніку іншай канфесіі «благословение» царквы? Калі чалавек з'яўляецца шчырым вернікам, то пры жаданні і сам сходзіць да сваёй царквы і там яму святар дабраславіць патрэбныя рэчы.

**Юры Шпак-Рыжкаў, Мінск**




## Картка «БелКарт» па-беларуску: аказалася, усё пазітыўна, але...

Калі Беларусбанк адмовіў мне ў просьбе вырабіць картку «БелКарт» з імем і прозвішчам уладальніка па-беларуску, я пакінуў запіс у кнізе заўваг і прапаноў.

Роўна праз тры дні мне патэлефанавалі і ветліва жаночы голас запрасіў у аддзяленне банка за новай карткай, асабліва было падкрэслена, што імя і прозвішча на ёй «на белорусском языке». Картка «БелКарт» выраблена на такой самай пластыкавай аснове, як і Maestro (да якой яна даецца давескам). Прозвішча ўладальніка выціснута кірыліцай.

Па словах супрацоўніцы Беларусбанка, калі вы хочаце атрымаць «БелКарт» па-беларуску, па-першае, прозвішча і імя павінны быць запоўнены ў заяве на беларускай мове (кірыліцай) — гэтага будзе (па словах супрацоўніцы) дастаткова, каб і на картцы вашае імя было па-беларуску. Па-другое, заява павінна паступіць у аддзяленне Беларусбанка да 5-га дня месяца, які пазначаны на картцы (тэрміна дзеяння карткі), бо калі на карт-рахунак штомесяц налічваецца заробак, банк аўтаматычна, без вашай заявы, пачынае працэс вырабу новай карткі, і па змоўчанні яна будзе на расійскай мове, таму гэты момант істотны.

Здавалася б, праблема вырашаная. Але, як выявілася, мне пашанцавала, што ў маім імені і прозвішчы не было літары «ў», магчымасць друку якой на картках, паводле «Банкаўскага працэсінгавага цэнтра», «цяпер адсутнічае».

Выплыла і яшчэ адна праблема. Аказалася, што яе нельга падключыць у інтэрнэт-банкінг да іншых картак.

Высветлілася, што можна падключыць альбо «Maestro», альбо «БелКарт», але адначасова абедзве нельга. Праблема менавіта ў тым, што картка «БелКарт» была выраблена і зарэгістравана ў сістэме банка з імем і прозвішчам у беларускім напісанні.

Быў вымушаны пакінуць новы запіс у кнізе заўвагаў і прапаноў.

**МЗ, Мінск**

## Наш цукар падаражэў

**Чаму наш цукар?** Тлумачу. Мае бацькі жывуць у вёсцы і раней ім «навязвалі» цукровыя буракі. Аплата за работу была канцавым прадуктам — цукрам. За прапалку 1 соткі — 1 кг цукру. За церабленне буракоў пасля механічнай уборкі за здадзеную 1 т буракоў — 3 кг цукру. Няцяжка падлічыць: за прапалку 1 га буракоў (100 сотак — 100 кг цукру). Пры ўраджайнасці 500 ц з гектара атрымліваюць 50 т буракоў. 50 т х 3 кг атрымліваем 150 кг цукру. У невялікім калгасе, дзе сеялі 300 га буракоў, народ атрымліваў 30 тон цукру за прапалку і 45 тон цукру за здадзеныя буракі (300 га х 50 т з гектара = 15 тыс. тон х 3 кг за 1 т).

На бураках працавалі дзеці і ўнукі, дапамагалі суседзі, знаёмыя і сябры. Цукар дзялілі на ўсіх, хто працаваў. Цукар стаяў на стале да гарбаты, яго елі дзеці з хлебам і блінамі, варылі сочыва, кампоты і г.д. Частка цукру ішла на самагонку. Адступлю ад тэмы. Што, сёння меней п'юць?

Правільна, на палі прыйшла тэхніка, замест ручной прапалкі ўносіцца «хімія». Я не за тое, каб вярнуцца да ручной працы. Але, можа, для свайго народа, сваіх дзяцей трэба выпускаць цукар без гербіцыдаў, пестыцыдаў, нітратаў і г.д.? Ці будзем чакаць, калі Расія зробіць аналіз і будзе як з малаком? Сёння тыя людзі, што працавалі на бураках, засталіся без працы і няма тых 200 альбо 300 кг цукру, якія яны зараблялі на бураках. Але затое хутка знайшоўся «гаспадар», каторы прыбраў цукар народа да рук, і сёння наш цукар падаражэў.

Новая тэхніка на палях (набытая за нашы грошы), меней выдатаў за ручную працу — цукар павінен быць таннейшы, а ён падаражэў. Не трэба казак пра нафту, неўраджаі, сусветны крызіс. Няма чаго зарабляць на сваім народзе. Паглядзіце на тых, хто застаўся не пры справах, хто зарабляў на буракаў хоць тры мяхі цукру — сёння ў іх гэта аднялі. Дайце ім працу, а не можаце даць працу, дайце дапамогу, каб яны маглі купіць сабе і дзецям цукар.

**С., Шчучын**

## Чакаем славянскага брата

Колькі памятаю з часоў незалежнасці адны размовы: расіяне прыехалі, скупілі зямлю, пасля скупілі кватэры і г.д. А станеш глыбей капаць, высвятляецца, што гэта беларусы, закінутыя воляй лёсу ў Расію, вяртаюцца на радзіму.

Спачатку пасылаюць сюды вучыцца дзяцей. Зарабіўшы пенсію, прыязджаюць і бацькі. Так было раней. А апошнім часам усё часцей з'яўляюцца карэнныя расіяне. Машыны з расійскімі нумарамі можна сустрэць у любой частцы Беларусі. Быццам хочуць тут нешта знайсці. Можа, сваё шчасце?

Прыезджыя з Масквы і Падмаскоўя асцярожныя. З расійскай глыбінкі — напорыстыя. Адзін такі зняў кватэру. Папрасіў зніжку на славянскае братэрства. Скінулі 20 у.а.. Папрасілі пашпарт. Кажа: «Часова адсутнічае». Паказвае пасведчанне пампезна названай арганізацыі. Кажа: «Наша кампанія купляе ў Беларусі адно прадпрыемства. Гэта толькі пачатак. Праз год у нас іх будзе тры ці чатыры».

Жонка не працавала. Адно дзіця, дзяўчынка 5 гадоў, але нанялі няню з педагагічнай адукацыяй. Абавязковая прыкмета заможнасці: няня ці гувернантка, як у серыялах. Жонка была маладая прыемная жанчына. Ад няні лішняга не патрабавала, таму ў той быў вясёлы хітраваты позірк (чаму б не зарабіць на чалавечай фанабэрыі?).

Праз год сям'я купіла джып. За машынай злёталі ў Арабскія Эміраты, там яны таннейшыя. Тыдзень пераганялі ў Беларусь. Імкліва каталіся па мінскіх вуліцах. А праз колькі месяцаў сям'я стала эканоміць грошы. Няня знікла, жонка з'ехала на радзіму, у Стаўрапольскі край, да мамы. Гаспадар пачаў прадаваць джып. Цану паставіў максімальна высокую, але купцоў не было. Ён збіраўся дадому, са скрухай у голасе гаварыў: «Заставайцеся тут са сваім бацькам...» Высветлілася, што набыццё прадпрыемства прабуксоўвала, дырэктар кампаніі рэзка скараціў зарплату.

Пакаваць рэчы была выкліканая сяброўка жонкі. Жанчына прыехала аж з Баранавіч і сумленна і акуратна два дні ўсё складала для транспарціроўкі. Усё гэта — за дзякуй і славянскае сяброўства. А гаспадар быццам быў заняты па справах. Пасля пагнаў у Баранавічы джып пад ахову сяброўкі, каб не плаціць у Мінску за стаянку. Дваістае ўражанне: здаецца, і дрэннага нічога не рабіў, а такое адчуванне, што з цябе хочуць скарыстацца.

Дзе ён цяпер? На якіх прасторах вандруе са сваім пасведчаннем з двухгаловым арлом? Невядома. Звёз з нанятай кватэры 6 крыштальных фужэраў і 2 падушкі. Пакінуў неаплачаны рахунак за тэлефон (90 тысяч). Звязаліся па мабільным, папрасілі разлічыцца. Адказаў, што будзе ў Мінску і ўсё верне. Да цяперашняга часу чакаем славянскага брата.

**Зоя С., Мінск**

## Заслаўе вартае асаблівага статусу

**Вакол Мінска плануецца стварыць дзевяць гарадоў-спадарожнікаў.** У тым ліку Заслаўе. Памойму, у Заслаўі варта стварыць не чарговы мегаполісны мікрараён з даўжэйшым даездам, а нейкае асаблівае паселішча... Усё ж гэта горадок з унікальна захаваным гістарычным цэнтрам.

Таксама паўстае пытанне транспарту. Калі ў Смалявічах пабудаваць 1—1,3 млн кв. м жылля, гэта які будзе пасажырапаток? На электрычку і так даводзіцца «забіць», паколькі ў яе бывае не ўцісняцца, а зараз і па дарозе стане не праехаць.

**Адлеглы, праз nn.by**

## Колькі ж беларускамоўных!

Нядаўна зарэгістраваўся ў сацыяльнай сетцы «Фэйсбук». Быў уражаны маштабамі беларускамоўнай супольнасці ў інтэрнэце. Не сказаць, каб я быў надта камунікабельны або меў надта шырокае кола знаёмстваў, але за першыя некалькі дзён зарэгістраваў каля сотні сяброў, якія падпісваюцца па-беларуску. Запрашэнні (мае і да мяне) працягваюць ісці.

**Віктар Завейскі, Мінск**

## Спадзяванне

Машына праляцела па шашы
Метэарытам у вечаровым змроку,
Спалохала на сметніку сароку,
На вуліцы вясковай — ні душы.
Зіма. З-пад стрэх звісаюць ледзяшы.
Машына праляцела па шашы.

Фальшывяць струны ў маёй душы,
Я пасварыўся з феяй сінявокай,
Машына сумавала ў гаражы,
Я зазірнуў у царкву каля дарогі,
Той, на крыжы, упрошваў: «Не грашы!
Слязьмі растопіш лёд сваёй душы».

Увесну празвінелі капяжы,
Мяне правіна страсянула токам.
Іду з павіннай. Ты частуеш сокам.
Бярозавік нясеш у гладышы,
Ідзеш і прыгажэеш з кожным крокам,
Увесну адзвінелі капяжы.

Спатканне летам у лугавой цішы,
Вольны казак — ад школы і ўрокаў,
Валошкаў сінь ля жытняе мяжы,
На сцежцы мітусяцца мурашы,
Зноў да мяне ідзеш ты лёгкім крокам,
Кахаю. Спадзяюся. Адкажы!

**Алесь Сакалоў, Баркалабава (Быхаўскі раён)**

## МОЙ ПЕРШЫ ВЕРШ

ЯК УЗДЫМАЎСЯ СЦЯГ...

*Аляксандру Каваленку.*

Як уздымаўся сцяг у неба
З хлапечай мужнае рукі —
Дрыжала пад манкуртам глеба,
Ён чуў Пагоню. Праз вякі

Яна, нябачная, імчала,
І гулам поўніўся прастор.
Душа з каленяў уставала,
Аковы падалі на дол.

А сцяг лунаў, і меркла зорка
Пяцікантовая пад ім.
Было так радасна і горка,
Трывожна-соладка усім

За той адчай, за смеласць тую,
Што сцяг у неба ўзнясла.
У хвіліну гэтую святую
Вакол пабольшала святла.



Ды толькі горыч прыгнятала,
Што можам мы адно глядзець,
Што маем смеласці замала
Вось так адчайна узляцець.

Пякучы сорам не ачах,
Што моўчкі ўсе вакол стаялі,
Як хлопца білі на вачах,
За вычын мужны зневажалі.

Дакуль мы будзем так маўчаць,
Датуль не будзем мы народам.
І ў цемры будзем мы блукаць,
І не пабачым век свабоды.

**Алена, Ліда**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Львоў — горад на любы густ

Львоў за сваю багатую гісторыю перажыў нямала гаспадароў. Затое цяпер тут кожны можа знайсці штосьці на свой густ.

Вузкаватыя вулкі, якія павуцінай выткалі стары горад, — аддушына для аматараў архітэктуры. Апараты з газвадой ды драўляныя тэлефонныя будкі — для тых, хто думкамі ў савецкім мінулым. Хоць да савецкай спадчыны стаўленне тут вельмі асаблівае. Каб у гэтым упэўніцца, неабходна зайсці ў цьмяны пад’езд па адрасе Рынкавы пляц, 14. Тут вы трапіце ў легендарную «Крыіўку» — стылізаваны пад падпольную кватэру байцоў Украінскай Паўстанцкай Арміі рэстаран.

Увогуле, Львоў зарабляе на сваёй гісторыі. І на імёнах знакамітых жыхароў — ад аўстрыйскага пісьменніка Захера-Мазоха да венгерскага вынаходніка Яна Зега, аўтара знакамітай газніцы.

Ад Вроцлава ці Вільні Львоў адрознівае адсутнасць прычасанасці і бляску. Магчыма, справа ў розных фінансавых магчымасцях, але гэта толькі дадае гораду шарму і сапраўднасці.

Жыхары Львова шануюць свой горад. Кожную яго драбніцу — рыпучыя драўляныя лесвіцы з бліскучымі парэнчамі ў пад’ездах, каваныя краты на вентыляцыйных люфтах у падмурках камяніц, старыя дрэвы ў атачэнні немаладых дамоў.

І, нарэшце, мова. Расійскую ў Львове пачуеш хіба толькі ад турыстаў. Па-ўкраінску гавораць усе — ад малога да старога, міліцыянты і таксоўшчыкі. І нават пэтэвэшнага выгляду маладзёны ў трэніках. Мы пра гэта пакуль толькі марым.

**Сямён Печанко,**
**фота аўтара**





**Сціплая абаяльнасць.**



**Натоўпы турыстаў знікаюць з вуліц горада толькі апоўначы.**




**У Львове шануюць Бандэру.**



**Кавярня «Мазох». Тут могуць пачаставаць не толькі півам.**



**У «Крыіўцы» можна сфатаграфавацца з кулямётам.**



**Армянская царква.**

# Мікола Нікалаеў: Святога Галікана спісалі з Льва Сапегі

Доктар навук Мікола Нікалаеў выдаў кнігу «Гісторыя беларускай кнігі. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага». Гэта першае такое выданне ад часоў Ластоўскага.

**«Наша Ніва»: Папярэднюю «Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі» выдаў у 1926 годзе Вацлаў Ластоўскі. Чым ваша даследаванне розніцца ад яго працы?**

**Мікола Нікалаеў:** Падыход Ластоўскага быў такі: што пісана кірыліцай — беларускае. Тое самае было і ў акадэміка Карскага. Я разглядаю усе кнігі, якія ствараліся на тэрыторыі Княства.

**«НН»: Падчас працы над кнігай вы зрабілі шэраг адкрыццяў.**

**МН:** Я заўважаў «запазычанні» ілюстрацый з нашых выданняў. Напрыклад, ілюстрацыя «Лагер юдэяў (дванаццаць кален Ізраіля)» з Брэсцкай Бібліі (1563) у 1565 годзе ў паменшаным выглядзе з'явілася ў кнізе, выдадзенай у Ліёне. Пра што гэта гаворыць? Што была адзіная культурная прастора.

**«НН»: Але ж гэта парушэнне аўтарскіх правоў.**

**МН:** Пра аўтарскія правы ніхто і не чуў тады. Дзе тая Францыя? Вось магілёўскаму друкару Вошчанку замовілі ілюстрацыі да кнігі «Турэцкая манархія». Ён узяў французскае выданне, зрабіў люстэркавыя копіі і ў 1678 годзе надрукаваў у Слуцку.

Я неяк гартаў кнігу «Аб святых патронах Польшчы і Літвы». Пагляджзеўшы на вобраз св. Галікана, задумаўся, дзе мог бачыць падобны твар. І мне падумалася пра Льва Сапегу. Знайшоў арыгінал партрэта Сапегі 1621 года. Я ўпэўнены, што мастак зрабіў люстэркавую копію з партрэта канцлера ВКЛ.

**Мікола Нікалаеў**

нар. у 1955 у Шчучыне (Гродзенская вобл.). Скончыў БДУ па спецыяльнасці «гісторыя, археалогія». У 1988 у Ленінградзе абараніў кандыдацкую дысертацыю «Славянская рукапісная кніга на беларускіх землях у XIV—XVIII стст.», у 1997 у Санкт-Пецярбургу — доктарскую дысертацыю «Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага». Летась выйшла яго фундаментальнае даследаванне «Беларускі Пецярбург». Працуе загадчыкам аддзела рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі.







**«НН»: «Кніжная культура ВКЛ» — гэта толькі першы том «Гісторыі беларускай кнігі». Калі з'явіцца другі?**

**МН:** Калі я прынёс рукапіс у выдавецтва, там пагадзіліся выдаваць кнігу пры ўмове, што будзе напісаны другі том, які пазнаёміць з гісторыяй кнігі да нашага часу. Склаўся аўтарскі калектыў, у які ўвайшлі выкладчыца Універсітэта культуры Ларыса Доўнар, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, прарэктар Акадэміі мастацтваў Міхась Баразна. Я выступаю ў якасці галоўнага рэдактара. Тэксты ўжо гатовыя. Восенню кніга павінна выйсці.

**Гутарыў**
**Кастусь Матушыч**

## Курэйчык піша сцэнар для Бекмамбетава

### Беларускі сцэнарыст заключыў кантракт з расійскай студыяй «Базілеус».

Андрэй Курэйчык возьме ўдзел у праекце «Новы год крочыць па краіне» — галоўнай расійскай навагодняй прэм'еры 2011 года. У фільма незвычайны фармат. Ён будзе здымацца некалькімі рэжысёрамі, стане адзінай гісторыяй з рознымі лініямі, якія пераплятаюцца. Для ўдзелу ў праекце запрошаны найлепшыя сілы расійскага кінематографа. Вядуцца перамовы з Паўлам Чухраем, Фёдарам Бандарчуком, Пётрам Бусловым («Бумер»), Аляксеем Сідаравым («Брыгада»), Аксанай Бычковай («Піцер FM»), Рэза Гігінеішвілі («Спякота»).

«Студыя Бекмамбетава — гэта самая «галівудская» студыя у Расіі. Узровень прафесіяналізму тут вельмі высокі, — паведаміў Андрэй Курэйчык. — Мне даручана напісаць адразу тры гісторыі, і ў іх ліку цэнтральную, на якую будуць «нанізаныя» ўсе астатнія гісторыі. Упэўнены, што гэта будзе вельмі незвычайнае, радаснае, навагоднее кіно!»

tut.by

## «Мы, беларусы» — занадта памяркоўная мелодыя

Папярэдні дыск хора «Унія», «Беларускія маршы і песні. Змагарная лірыка», стаў легендай. Цяпер Кірыла Насаеў выдаў новы альбом — «Музыка беларускіх храмаў». Хормайстар разважае пра прыроду рэлігійных гімнаў і дае ацэнку свецкім «галоўным песням».

**«НН»: Спадар Кірыла, на дыску — спевы ўсіх канфесій пад адной вокладкай. Што іх яднае?**

**Кірыла Насаеў:** На беларускую рэлігійную музыку паўплывалі народныя спевы. Напрыклад, першыя беларускія пратэстанцкія напевы стваралі польскія кампазітары Цыпрыян Базылік і Вацлаў з Шамотул, якіх запрасіў Мікалай Радзівіл Чорны. Палякаў скарыла мелодыка беларускіх напеваў, яны пачалі складаць творы ў агульнаеўрапейскай стылістыцы, але ж у іх адчуваецца ўплыў народных песень. Падобны сплаў кананічнага з народным адбываўся і ў каталікоў, і ў праваслаўных.

**Кірыла Насаеў**

Нар. у 1960 ва Украіне. Дырыжор, хормайстар. Скончыў Беларускую акадэмію музыкі. Кіраўнік хораў «Унія», Fama Bona, «Менка». Адзін з адраджальнікаў мужчынскіх камерных спеваў у Беларусі. Сфера прафесійных зацікаўленняў: літургічная музыка, філасофія старадаўняй музыкі.

**«НН»: Сяргей Дубавец сказаў, што сваім альбомам 1998 года «Маршы і песні» вы паставілі пытанне, якая песня павінна стаць гімнам і што ў гімне мусіць быць. Дык якім мае быць беларускі гімн?**

**КН:** У мяне ёсць заўвагі да ўсіх песняў, якія прэтэндуюць называцца гімнам. «Пагоня» і «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» — змагарныя. Няма асэнсавання мінуўшчыны. Цяперашні дзяржаўны гімн «Мы, беларусы» — наадварот, надта памяркоўная мелодыя, а трэба такая, каб было змаганне, незалежнасць усё ж.

Пакуль няма дзяржавы, угрунтаванай на нацыянальных каштоўнасцях, — не можа быць і сапраўдных сімвалаў. Калі народ усвядоміць, што ідзе пад сцягам, — тады з'явіцца адпаведны гімн. Вядома, найперш сцяг: гэта адчуванне вялікага мінулага і повязь часоў. А гімн у дадатак — як маніфест цяперашняга пакалення, сённяшняй дзяржавы. Як паказвае досвед іншых краінаў, мяняць гімн можна.

**«НН»: Дык што, ідэальнага варыянта няма?**

**КН:** У «Полацкім сшытку» ёсць кампазіцыя, якая так і называецца, — «Гімн». Велічная, магутная мелодыя, старажытная — яшчэ з XVII ст. Хіба, пакуль бракуе словаў.

**«НН»: Ці плануецца перавыданне «Маршаў і песняў» на CD?**

**КН:** Няма калі. Хутчэй, выйдзе новы дыск «Маршы і песні — 2», у нас жа назапасіўся цэлы пласт лірычных, а таксама застольных песень.

**Гутарыў Павал Касцюкевіч**




На дыску «Музыка беларускіх храмаў» сабраныя праваслаўныя, каталіцкія, уніяцкія, пратэстанцкія музычныя творы XV—XXI стст. Усяго 24 трэкі: гімны, псалмы, часткі літургіі, канты, а таксама ўрыўкі са «Слонімскага сшытка» і Брэсцкага канцыянале. У запісе дыска ўзялі ўдзел хор «Унія», хор Петрапаўлаўскай царквы, народны хор.

**Музыка беларускіх храмаў/Religious Music of Bielarus.** Серыя «Беларуская музычная калекцыя». Мінск: «Вігмагруп», 2009.

ДАСЛОЎНА

## The Toobes: Ничего не понял. Это принципиально на белорусском?




У час уручэння музычных узнагарод сайта Experty.by лідэр гурта The Toobes Стас Ламакін адмовіўся разумець па-беларуску і прызнаўся, што не ведае, што значыць «пераможца».

**— Вы сталі пераможцамі ў шмат якіх намінацыях па версіі музычных крытыкаў і экспертаў. Наколькі гэта для вас важна?**

**Стас Ламакін (СЛ):** На русском можно? Я ничего не понимаю, что ты сейчас сказал. Что такое «пераможца»?

**Стас Мурашка (СМ):** Если это возможно, мы бы хотели на русском.

**— Вы беларусы?**

**СЛ:** Я вообще из Казахстана. Но мы белорусская группа.

**СМ:** Да, я беларус.

**СЛ:** Может мы вообще не будем давать интервью.

**СМ:** Тогда мы не будем давать интервью.

**— Наколькі, наогул, вам цікава чытаць водгукі іншых людзей пра вашу творчасць, песні, альбомы?**

**СМ:** Что он сказал?..

**— Вы можаце сабраць усе магчымыя ўзнагароды ў Беларусі. Ці задаволіцеся гэтым, альбо маеце планы па заваёве свету?**

**СЛ:** Ничего не понял. Это принципиально на белорусском? Если вы хотите продуктивное интервью, то лучше, чтобы вы говорили на русском.

**СМ:** Я считаю, что если ты говоришь с людьми, то надо стараться говорить на их языке. Если это возможно, если нет — то нужен переводчик.

**— Вы думаеце, што беларускаму журналісту для размовы з беларускай групай патрэбны перакладчык?**

**СМ:** Мы упираемся в язык. Вы ещё спросите, почему мы по-белорусскому не поём (смеяцца).

**— Дык а чаму?**

**СМ:** А вот это я не буду отвечать.

**СЛ:** Я тоже не хочу. Это скрытое обвинение как будто в нашу сторону идёт: почему вы в Беларуси не по-белорусски. Мне неприятно: вы говорите по-белорусски, мы по-русски. Мы на разных языках говорим. Мне это неприятно.

**Размаўляў Сяргей Будкін, «Тузін Гітоў»**

# Узлёт Новікава, падзенне Кушніра

Алімпіяда ў Ванкуверы можа стаць самай паспяховай за ўсю гісторыю беларускай «зімовай» зборнай. Дастаткова яшчэ аднаго медаля.

### Не даўся Б’ёрндалену

Самым паспяховым беларускім днём на Алімпіядзе было 18 лютага, калі ў скарбонцы зборнай з’явілася адразу два медалі. Абодва па біятлоне.

Першай бронзавую ўзнагароду прынесла Дар’я Домрачава. У індывідуальнай гонцы на 15 кіламетраў яна толькі аднойчы прамахнулася і саступіла нарвежцы Туры Бергер і прадстаўніцы Казахстана Алене Хрусталёвай. Цікава, што расіянка Хрусталёва яшчэ на Алімпіядзе ў Солт-Лейк-Сіці выступала за Беларусь.

Апярэдзіць Домрачаву магла толькі ўкраінка Валя Сімярэнка, але яна спудлавала на апошнім рубяжы. Сонечную ўсмешку Дашы на п’едэстале гонару злавілі ў аб’ектывы сусветных інфармагенцтваў.

Але на поспех Домрачавай і варта было разлічваць. Яна — яскравы талент. А вось медаль Сяргея Новікава стаў абсалютнай нечаканкай. У гонцы на 20 кіламетраў 30-гадовы спартовец не прамахнуўся ні разу. І з апошняга агнявога рубяжа сыходзіў першым, выйграючы ў тытулаваных нарвежцаў Свендсана і Б’ёрндалена.

Хуткасцю на лыжні Новікаў саступаў скандынавам, але браў настроем. Свендсану беларус, праўда, такі прайграў, а вось з легендарным Оле-Эйнарам Б’ёрндаленам прыйшоў імгненне ў імгненне. Срэбраныя медалі далі абодвум спартоўцам.

Успамінаючы тую гонку, ураджэнец Чавусаў сказаў, што пасля апошняй стральбы ў галаве мільгнула думка: «Бяжы, Сяргей, дзеля гэтага ты ішачыў усё жыццё». Новікаў, не саромеючыся, прызнаўся, што няёмка адчуваў сябе на п’едэстале з такімі супернікамі. Да гэтага медалёў беларус не браў ніколі. Будзем спадзявацца, новыя дасягненні яшчэ наперадзе. Біятлон лічыцца «позним» відам спорту, тут поспехі ў 23—24 гады — выключэнне.



Сяргей Новікаў (справа) няёмка адчувае сябе побач з вялікім Оле-Эйнарам Б’ёрндаленам.



Усмешка Дашы Домрачавай упрыгожыла п’едэстал індывідуальнай гонкі біятланістак.



Надзея Алімпіяды Антон Кушнір занадта рана палічыў, што ўжо ў фінале.



Фігурыст Яўген Плюшчанка (злева) засмучаны срэбрам. Расіяне зноў палічылі, што іх засудзілі.



Трэнер Захараў спрабуе абвергнуць сваіх нядобразычлівцаў. Хакейная зборная на жылах перамагла немцаў.

У астатніх біятлонных гонках найлепшы вынік паказала ўсё тая ж Домрачава. У масстарце яна была шостай, а ў спрынце — восьмай. Варта адзначыць таксама Людмілу Калінчык. Барысаўчанка аднойчы трапіла ў дзясятку.

### Трагедыя Кушніра

Алімпійскі від спорту, у якім Беларусь мае наймацнейшую ў свеце школу, — фрыстайл. Медалі ў фрыстайле пакуль не разыгрываліся. Аднак прайшлі кваліфікацыі. З шасці спартоўцаў, выгадаваных на раўбіцкіх трамплінах, у фінал прабіліся пяць. І трэба ж такому здарыцца, што адзіным няўдачнікам стаў Антон Кушнір.

Гэты фрыстайліст па праву лічыўся галоўнай надзеяй беларусаў на золата Ванкувера. І першая спроба толькі пацвердзіла гэта. Антон ідэальна скокнуў і размясціўся на першым радку табліцы. Трэба ж яму было зваліцца падчас другой спробы... Суддзі не зліталіся над уладальнікам сёлетняга «Крышталёвага глобуса» (яго атрымлівае пераможца агульнага заліку Кубка свету), і Кушнір стаў толькі пятнаццатым.

Цяжка патлумачыць гэты правал. Ці то Кушнір зарана расслабіўся, ці гэта быў проста няшчасны выпадак.

Затое ў фінал трапілі Дзмітры Дашчынскі (4-ы), Аляксей Грышын (7-ы), Цімох Слівец (12-ы).

У жанчын падобны выпадак, як у Кушніра, здарыўся з сястрой Цімоха, Асоль Слівец. Яна звалілася падчас першай спробы на засцерагальную агароджу. Аднак на другім падыходзе выправілася і з гонарам трапіла ў дванаццатку наймацнейшых.

Прэтэнзій да выступу Алы Цупер быць не можа ніякіх. Яна бліскуча выканала абедзве спробы і заняла ў кваліфікацыі першае месца.

| Медальны залік | золата | срэбра | бронза | агулам |
|---|---|---|---|---|
| 1. Германія | 7 | 9 | 5 | 21 |
| 2. ЗША | 7 | 8 | 10 | 25 |
| 3. Нарвегія | 6 | 3 | 5 | 14 |
| 4. Канада | 5 | 4 | 1 | 10 |
| 5. Швейцарыя | 5 | 0 | 2 | 7 |
| ... | | | | |
| 11 Расія | 2 | 3 | 6 | 11 |
| ... | | | | |
| 17 Польшча | 0 | 3 | 1 | 4 |
| 18. Латвія | 0 | 2 | 0 | 2 |
| ... | | | | |
| **21 Беларусь** | **0** | **1** | **1** | **2** |
| ... | | | | |
| 26 Эстонія | 0 | 1 | 0 | 1 |

### У хакеі без сенсацый

Зборная па хакеі на першым этапе выступіла, як ад яе і чакалі. Хіба што правальным быў першы матч супраць фінаў. Хлопцы Захарава не змаглі супрацьстаяць Суомі — 1:5.

Затое са шведамі пабадаліся. Пры канцы трэцяга перыяду лік быў 2:3 на карысць скандынаваў. Беларусы траплялі ў перакладзіну, атакавалі. Аднак за «трэ крунер» («тры кароны») сыграў досвед. Ужо на апошняй хвіліне Даніэль Альфрэдсан зняў усе пытанні аб пераможцы — 2:4.

Валідольна-карвалольнай, як любіць выказвацца тэлекаментатар Уладзімір Навіцкі, была гульня з немцамі. Здавалася б, калі Сяргей Касціцын у трэцім перыядзе зрабіў лік 3:1 на нашу карысць, усе пытанні аб пераможцы зняліся. Аднак цягам хвіліны (!) каманда Уве Крупа змагла закінуць дзве шайбы і выраўняць лік.

У такія моманты гульню на сябе бяруць лідэры. І капітан Руслан Салей вывеў беларусаў зноў наперад, а Аляксей Калюжны дабіў праціўніка — 5:3.

У лыжных гонках, каньках і горных лыжах у беларусаў традыцыйныя правалы. Але і так сёлетняя Алімпіяда па колькасці медалёў у беларускай зборнай ужо зраўнялася з першай «самастойнай» Алімпіядай у Лілехамеры ў 1994 г.

**Зміцер Панкавец**

# Сяргей Шчурко: Мы робім з алімпійцаў герояў. Прыемна, калі яны і з’яўляюцца такімі

Гутарка пра Алімпіяду са спартовым журналістам, аўтарам кнігі «Каханне і спорт» **Сяргеем Шчурко**.

**«Наша Ніва»: З якімі пачуццямі сочыце за гэтай Алімпіядай?**

**Сяргей Шчурко:** Балею за Дарку Домрачаву, Дзіму Дашчынскага, Цімоха і Асоль Слівец. Мне прыемныя гэтыя людзі. Яны і ёсць нашыя асноўныя надзеі на Алімпіядзе. Часта з алімпійцаў мы робім герояў. Прыемна, калі яны і з’яўляюцца такімі. Усе вышэйпералічаныя людзі дапамагалі ў арганізацыі дабрачынных акцый у дзіцячых дамах. Таму для мяне героем Алімпіяды стала Дарка. Мы з ёй перапісваемся, я ведаю, што яна прыхварэла. У масстарце я балеў не проста за Дарку, а за яе здароўе. І нават у такім стане яна змагла заняць шостае месца. Дарка — баец. Спадзяюся, што кожны пабачыць на гэтай Алімпіядзе свайго героя, якім можна ганарыцца.

**«НН»: Поспех Домрачавай для вас быў чаканы?**

**СШ:** Усе чакалі. Дарка адна з найлепшых біятланістак свету. Але я лічу, што яна яшчэ не раскрыла да канца свой патэнцыял. Ёй ёсць куды расці.

**«НН»: А вось медаля Новікава дакладна ніхто не чакаў. Як так, што спартсмен, які нічога не выйграваў у сваім жыцці, падняўся на п’едэстал у Ванкуверы?**

**СШ:** Так бывае. Быў такі біятланіст Яўген Рэдзькін. У 1992 годзе ён выйграў індывідуальную гонку на Алімпіядзе ў Альбервіле, а перад гэтым і пасля абсалютна нічога не выйграваў. Гэтым і цудоўны спорт. За тое мы яго і любім. Новікаў не самы хуткі біятланіст, але ён выдатны стралок. Я размаўляў з ягонымі бацькамі, жонкай. Нават для іх гэта быў сюрпрыз.

**«НН»: Правал Антона Кушніра з галіны псіхалогіі?**

**СШ:** Я не ведаю. Ніхто не ведае, апроч самога Антона. Думаю, што не ведаюць нават тыя людзі, якія знаходзяцца зараз у Ванкуверы. Разважаць пра прычыны гэтай няўдачы я лічу неэтычным.

**«НН»: А як Вам трэнер Захараў? Ён дае рады сваёй задачы?**

**СШ:** Мне сімпатычны Хэнлан. Я ўпэўнены, што пры ім каманда паказала б лепшы вынік. А Захараў, вядома, несімпатычны большай частцы беларускіх заўзятараў. Аднак мне здаецца, што гэта яго і заводзіць. Штурхае наперад.

**«НН»: Расіяне паднялі шуміху праз срэбра фігурыста Яўгена Плюшчанкі. Гэтае месца аб’ектыўнае?**

**СШ:** Расійскі сіндром усім вядомы. Калі іхні спартсмен займае не найвышэйшы радок, то пачынаюцца крыкі, што Расію засуджваюць, што вакол ворагі. Але ніхто нават не задумваецца: дык, можа, камбінацыі Плюшчанкі не былі самымі выдатнымі? Для мяне тут важная пазіцыя шматразовай алімпійскай чэмпіёнкі Ірыны Радніной. Яна кажа, што Плюшчанку няма на што скардзіцца. Ён не быў на галаву мацнейшы за супернікаў.

**«НН»: Беларусы прэтэндуюць на медалі толькі ў двух відах спорту. Для нас гэта многа ці мала?**

**СШ:** З нашым сённяшнім падыходам да спорту — гэта нармальна. У нас мала прафесіяналаў. Асабліва для такой колькасці грошай, што выдзяляецца дзяржавай. І для мяне тут зноў характэрны выпадак з Хэнланам. Чаму б не запрасіць галандскіх спецыялістаў для канькоў, фінаў — на лыжы, карэйцаў — на шорт-трэк. Гэта б магло даць плён.

**Гутарыў ЗП**







МЕСЦА СПАТКАННЯЎ

# Беларускія танцы ў Мінску — шточацвер

Шточацвер ад 19-й да 23-й у кавярні «Жар-птушка» адбываюцца беларускія вечарынкі. Уваход каштуе 6 тыс. рублёў з носа. За звычай збіраецца каля 70—80 чалавек. Наведваюць танцы пераважна юнакі і дзяўчаты: студэнты і працоўныя. Але прыходзяць часамі, у ранейшыя гадзіны, і сем'і з дзецьмі-школьнікамі, якія паміж танцамі тусуюцца ля гульнявых аўтаматаў. Для дзяцей уваход нічога не каштуе.

На танцах вучаць ойру, падэспан, полькі. Большасць наведнікаў — беларускамоўныя.

Кавярня месціцца ў парку Горкага, ля вадаспаду. Даезд да метро «Плошча Перамогі» ці аўтобусам нумар 100 па праспекце. Або трамваямі да прыпынку «Парк Горкага».

## КАНЦЭРТЫ

### «Тройца» на Малой сцэне Купалаўскага

**27 лютага на Малой сцэне Купалаўскага тэатра** выступае этна-трыа «Тройца». **Пачатак а 19-й.**

### Mauzer

**26 лютага ў клубе «Рэактар» (вул. Харужай, 29)** выступае гурт Mauzer. Пры ўдзеле: **«Сьцяна»**, **Akute**. **Пачатак а 18-й.**

### Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва

**У Філармоніі 25 лютага** пройдзе канцэрт Аляксандра Фісейскага з цыкла «Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва». У праграме — творы І.С.Баха. **Пачатак а 19-й.**

### Сустракаем вясну разам з Concordia Chor

«Будзе вясна!» — пад такой назвай **28 лютага ў Палацы прафсаюзаў** пройдзе канцэрт Concordia Chor. **Пачатак а 19-й.**

### Consul Band & Madera Hard Blues

**25 лютага ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** выступае Consul Band & Madera Hard Blues. Асноўны музычны кірунак вечарыны, як вы здагадаліся, блюз. **Пачатак а 19-й.**

### Kriwi

**27 лютага ў «Графіці»** — Kriwi. **Пачатак а 18-й.**

### Apple Tea ў «Графіці»

**28 лютага а 18-й у «Графіці»** — «Apple Tea». Інтрыга вечарыны — удзел спецыяльнага госця — Тэса Саўтэр.

## ІМПРЭЗЫ

### Паветра-2010

**25 і 26 лютага ў НВЦ «БелЭкспа» (вул.Купалы, 27)** пройдзе 1-ы Беларускі карнавал паветраных шароў «Паветра-2010». Для гасцей карнавала — чароўны і бязмежны свет аэрадызайну ад прафесіяналаў і аматараў!

### Сем цудаў Беларусі

**26 лютага а 18-й у бібліятэцы імя Цёткі (вул.Талбухіна, 12а)** прэзентуецца вандроўна-эстэтычны праект «Сем цудаў Беларусі. Цуд першы: Сафійскі сабор». Вас чакае сустрэча з народжанымі каля Сафіі (Пятро Васючэнка, Навум Гальпяровіч, Юрась Пацюпа) і з натхнёнымі Сафіяй (Васіль Жуковіч, Валянціна Коўтун, Людміла Рублеўская, Зміцер Сідаровіч, Вадзім Спрынчан). Уваход вольны.

### «Урок беларускай мовы» — у Нью-Ёрку

**25—28 лютага ва Украінскім Музеі, што на Манхэтане**, пройдзе кінафэст, у якім возьме ўдзел і фільм пра Беларусь. «Урок беларускай мовы» будзе паказаны ў апошні дзень кінафэсту. Фільм Міраслава Дэмбіньскага «Урок беларускай» факусуе сваю ўвагу на навучэнцах і прыхільніках мінскага Коласаўскага ліцэя — беларускай навучальнай установы, якая пасля забароны працягнула навучанне ў падполлі. Падзеі прэзідэнцкіх выбараў 2006 года становяцца кульмінацыяй фільма. **Нядзеля, 28 лютага, удзень, а 14-й.** Квіткі можна набыць загадзя на афіцыйным сайце фэсту kinofestNYC.com ды на сайце арганізатара мерапрыемства — Украінскага Музея ukrainianmuseum.org. Адрас: 222 East 6th Street (between 2nd і 3rd Avenues), New York, NY 10003, тэлефон: 212-228-0110. Метро: лінія «6» да прыпынку «Astor Pl» ці лінія «R» да станцыі «8th St».

## ВЫСТАВЫ

### Цёплае дрэва — халодны метал

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 21 сакавіка** працуе выстава разьбяра і чаканшчыка Юрыя Адамовіча «Цёплае дрэва — халодны метал». Работы выкананыя ў мяшанай тэхніцы, што яднае ў сабе разьбу па дрэве і халодную, ручную, прарэзаную, аб'ёмную чаканку.

### Тэатр юнага гледача і яго гісторыя

Чым жыў тэатр дзесяцігоддзі таму? Якімі афішамі заклікаў да сябе дзетак, а таксама іх бацькоў? Пра ўсё гэта можна даведацца на выставе, прысвечанай 55-годдзю творчай дзейнасці Тэатра юнага гледача, якая працуе **да 31 сакавіка ў «Гасцёўні Уладзіслава Галубка» (вул.Старавіленская, 14)**.

### Арт-кірмаш у галерэі «Ў»

**Да 28 лютага ў галерэі «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)** — «Арт-кірмаш», на якім будуць прадстаўленыя працы мастакоў галерэі.

### Балтыйскі шлях, які змяніў свет

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 14 сакавіка** працуе фотавыстава «Балтыйскі шлях, які змяніў свет. Падзеі 23 жніўня 1989 г.», прысвечаная 20-й гадавіне найбуйнейшай сімвалічнай акцыі народаў Літвы, Латвіі і Эстоніі за незалежнасць. Тысячы людзей, пабраўшыся за рукі, утварылі жывы ланцуг, які злучыў тры балтыйскія дзяржавы ў іх імкненні да свабоды.

### Кветкавы баль

**У Музеі гісторыі літаратуры (вул.Багдановіча, 13) да 9 сакавіка** працуе выстава фларыста Дзіны Шымук «Кветкавы баль». Дзіна Шымук — першы беларускі фларыст, яна працуе ў тэхніцы ашыбана. Гэта жывапіс раслінамі. Мастак збірае і засушвае кветкі, зёлкі, лісце, а пасля стварае з іх творы.

## ТЭАТРЫ

**25 лютага**

**Тэатр лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»
**Тэатр оперы і балета** — Канцэрт з твораў Сяргея Картэса. Юбілей.
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Кабала святош (Мальер)»

**26 лютага**

**Тэатр оперы і балета** — «Карміна Бурана. Кармэн-сюіта»
**Тэатр лялек** — «Чайка. Досвед прачытання»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі музыкі-вар'ята»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**27 лютага**

**Тэатр лялек** — «Жудасны спадар Аў»
**Тэатр юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр оперы і балета** — «Багема»

**28 лютага**

**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр лялек** — «Піпі-Доўгаяпанчоха»
**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Тэатр оперы і балета** — «Спячая прыгажуня»

**2 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»

**3 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**4 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»

**5 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»

**6 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна-жабка» (11.00)
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

**7 сакавіка**

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

# Самыя цікавыя выступы беларускіх спартоўцаў у Ванкуверы

| Дата | Дысцыпліна | Час (мясцовы, беларускі) |
|---|---|---|
| **Біятлон** | | |
| 26, пятніца | Эстафета 4х7,5 км (мужчыны) | 11.30 (21.30) |
| **Лыжныя гонкі** | | |
| 28, нядзеля | Гонка 50 км, класічны стыль (мужчыны) | 09.30 (19.30) |
| **Фрыстайл** | | |
| 24, серада | Акрабатыка, фінал (жанчыны) | 19.30 (05.30) |
| 25, чацвер | Акрабатыка, фінал (мужчыны) | 18.00 (04.00) |
| **Хакей з шайбай** | | |
| 24, серада | Чвэрцьфінал (мужчыны) | 12.00 (22.00) |
| | Чвэрцьфінал (мужчыны) | 16.30 (02.30) |
| | Чвэрцьфінал (мужчыны) | 19.00 (05.00) |
| | Чвэрцьфінал (мужчыны) | 21.00 (07.00) |
| 26, пятніца | Паўфінал (мужчыны) | 12.00 (22.00) |
| | Паўфінал (мужчыны) | 18.30 (04.30) |
| 27, субота | Матч за 3-е месца (мужчыны) | 19.00 (05.00) |
| 28, нядзеля | Фінал (мужчыны) | 12.15 (22.15) |

## КІНО

### Праклятая выспа Марціна




**Выспа праклятых** (Shutter Island)
ЗША, 2009, каляровы, 138 хв.
**Рэжысёр:** Марцін Скарсэзэ
**Ролі выконваюць:** Леанарда ДзіКапрыа, Марк Руфала, Мішэль Уільямс
**Жанр:** трымценнік паводле рамана Дэніса Легайна
**Адзнака:** 5 (з 10)

1954 год. Дэтэктыў расследуе загадкавае знікненне забойцы-вар'яткі з псіхіятрычнай лякарні. Лякарня-крэпасць стаіць на выспе, схавацца няма куды...

Карціна Марціна Скарсэзэ здзіўляе ліхаманкава-імпэтнай гульнёй Леанарда ДзіКапрыа. Фільм ціснe на мозг шэра-свінцовым небам, паранаідальнай замкнёнай прасторай, чырвонымі мурамі і навязлівымі галюцынацыямі.

Рэжысёр, з вялым пафасам амерыканскага класіка, даследуе гвалт, супрацiў, памяць і ачалавечанасць.

Пацыентам, незнаёмым з жанравым кіно, «вынас мозга» гарантаваны.

**Андрэй Расінскі**

# Самалёт Узброеных сіл ЗША лазерам знішчыў балістычную ракету

**Гэты момант можа стаць рэвалюцыйным для развіцця ваенных тэхналогій.**

12 лютага ЗША правялі выпрабаванні лазера паветранага базіравання, пры дапамозе якога ўпершыню атрымалася знішчыць балістычную ракету. Лазер быў размешчаны на адмыслова абсталяваным самалёце Boeing 747.

Лазерная сістэма з дапамогай сэнсараў на працягу некалькіх секунд выявіла ракету, запушчаную з марскога носьбіта. Для яе адсочвання выкарыстоўваўся нізкаэнергетычны лазерны зарад. Пасля сістэма выпусціла другі зарад нізкай магутнасці, неабходны для ацэнкі атмасферных умоваў і карэкціроўкі агню.

Пасля гэтай падрыхтоўкі сістэма накіравала ў адсочаную цэль звышмагутны промень лазера, які проста расплавіў ракету. Уся аперацыя па выяўленні, прыцэльванні і далейшым знішчэнні ракеты заняла менш за дзве хвіліны.

Праз гадзіну з наземнай платформы была выпушчана другая ракета, і лазернай сістэме зноў удалося паспяхова знішчыць яе.

«Рэвалюцыйнае выкарыстанне накіраванай энергіі з'яўляецца вельмі прывабным для супрацьракетнай абароны, паколькі дае патэнцыял для атакі шматлікіх аб'ектаў з хуткасцю святла на адлегласці сотняў кіламетраў», — гаворыцца ў прэс-рэлізе Вайскова-марскіх сілаў ЗША. Звяртае ўвагу адносна нізкі кошт лазерных перахопнікаў у параўнанні са звычайнымі тэхналогіямі.

Амерыканская карпарацыя Northrop Grumman абвясціла аб стварэнні электрычнага лазера магутнасцю каля 100 кВт, прыдатнага для выкарыстання ў вайсковых мэтах, у сярэдзіне сакавіка 2009 г.

**Алесь Пілецкі**



## Сапраўдная беларуская кухня

### Фрыкадэлькі з цялячай пячонкі

1 пячонка, 1 цыбуля,
0,5 французскай булкі (багеткі),
трошкі перцу і солі, 2 яйкі,
2 лыжкі смятаны, 1 лыжка масла,
2—3 сухарыкі, вада або малако

Падрыхтаваць пячонку: зняць плеўку, дробна пакрышыць і пасаліць. Пакрышаную цыбулю абдаць варам, падсмажыць на масле, змяшаць з пячонкай, дадаць кавалак вымачанай у вадзе або малацэ і адціснутай булкі, убіць яйкі, дадаць смятану, соль і перац, пракруціць праз мясарубку, фарш перамяшаць і зрабіць з яго фрыкадэлькі. Фрыкадэлькі адварыць у булёне з цяляціны і падаць з ім. Такія ж фрыкадэлькі можна рабіць з пячонкі парасяці. Іх падаюць з булёнам з парасяціны.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

ПАДАРОЖЖЫ

# На Чэмпіянат свету па футболе — ад $5 тысяч

**Колькі каштуе і як адправіцца на свята футбола ў Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку?**

Трапіць хаця б раз у жыцці на спаборніцтвы такога кшталту марыць кожны сапраўдны футбольны заўзятар. Бліжэйшае свята адбудзецца сёлета ад 11 чэрвеня да 11 ліпеня ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы (ПАР). І няхай зборная Беларусі туды не патрапіла, айчынныя балельшчыкі знойдуць за каго перажываць.

### Прапанова ФІФА

Беларусы могуць пашкадаваць, што на чэмпіянат не патрапіў ніхто з суседзяў — ні Польшча, ні Украіна, ні Расія, ні Літва з Латвіяй. Кожная краіна, якая будзе ўдзельнічаць у спаборніцтвах, атрымае некалькі дзясяткаў тысяч білетаў для сваіх фанатаў. Звычайна частка з гэтых квіткоў перападала і беларусам, але сёлета не пашчасціла.

Усяго плануецца рэалізаваць каля трох мільёнаў квіткоў. Самыя дарагія з іх каштуюць 900 даляраў, самыя танныя — 20 даляраў для грамадзянаў ПАР і 80 даляраў для тых, хто мае пашпарт іншай краіны.

Цяпер працягваецца чацвёрты, перадапошні этап продажу білетаў праз сайт fifa.com. Ён скончыцца 7 красавіка. Заяўкі апрацоўваюцца ў працэсе чаргі — калі паспяшацца, то яшчэ можна паспець забраніяваць білет на патрэбную гульню.




Праўда, квіткі на паўфінал і фінал ужо скончыліся.

### Альтэрнатыва

Турыстычныя кампаніі арганізоўваюць туры на 10—12 дзён з актыўным адпачынкам і наведваннем 2—3 футбольных матчаў. Беларускія фірмы з паўднёваафрыканскім накірункам практычна не працуюць. Таму прыйдзецца звяртацца да расійскіх, украінскіх альбо польскіх.

Напрыклад, тур на сем дзён з наведваннем паўфіналаў і фіналу каштуе каля 12 тысяч даляраў. У гэты кошт уключаны і авіяпералёт. А вось экскурсіі аплачваюцца асобна — каля 150—200 даляраў кожная.

Можна рызыкнуць і адправіцца ў ПАР самому. Авіяпадарожжа з Кіева ў Ёханэсбург і назад абыдзецца ў 750 даляраў. Пражыванне ў прыстойных гатэлях — ад 50 даляраў за ноч. Яшчэ каля 50 даляраў штодзень будзе каштаваць арэнда аўтамабіля. Бяспека — асобнае пытанне. Па ўзроўні крыміналу ПАР нашмат вылучаецца сярод іншых афрыканскіх краін.

Цэлыя раёны Ёханэсбурга зарабляюць крадзяжамі і рабункамі. Так што гуляць па горадзе турыстам не раяць. Каля 200 даляраў каштуюць паслугі расійскамоўнага гіда. Англамоўныя, дарэчы, удвая таннейшыя. Віза — яшчэ 100 даляраў. Варта дадаць яшчэ хаця б парачку экскурсій, харчаванне, кошт білетаў... Такім чынам, самастойнае падарожжа можа абысціся ў 5—6 тысяч даляраў.

Як заўсёды, напрыканцы пра надвор'е. Варта не забывацца, што ў ПАР ў чэрвені — зіма. Паўднёвае ўзбярэжжа нагадае футбольным фанатам беларускі клімат позняга беларускага кастрычніка. Карацей, мала прыемнага.

**Ягор Марціновіч**

## Прыватныя абвесткі

**КАНТАКТЫ**

**Шукаю неабыякавых да жыцця** людзей дзеля стварэння сумеснага бізнэс-праекта. Т.: (029) 294-02-02. Сяргей.

**ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашем** у вандроўку 7 сакавіка па маршруце: Мінск—Іўе—Ліпнішкі—Суботнікі—Жамыслаўе—Тракелі—Больценікі—Беняконі—Гайцюнішкі—Канвелішкі—Мінск. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43.

**СПАЧУВАННІ**

**Выказваем** шчырыя спачуванні Пятроўскай Ядвізе Язэпаўне ў сувязі са смерцю сястры. Сябры, знаёмыя з ТБМ.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ЗДАРОЎЕ

# Сіфіліс у Беларусь вязуць з Расіі

**Больш за 1% насельніцтва перахварэў на пранцы ад 1986 да 2000 года.**

Беларусы сталі радзей пакутаваць ад захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам. Аднак усе, хто мае трох ці болей сэксуальных партнёраў на год, трапляюць у групу рызыкі. Яны маюць усе шанцы падхапіць пранцы ці застацца бясплодным пасля хламідыёзу.

Паводле словаў Ірыны Шыманскай, галоўнага пазаштатнага дэрматавенеролага Мінздароўя, у 1990-я Беларусь перажыла пад'ём колькасці захворванняў на хваробы, якія перадаюцца палавым шляхам. Ажно больш за 1% насельніцтва перахварэў на пранцы ад 1986 да 2000 года. У 2000-я гады хваля эпідэміі пайшла на спад.

Колькасць выпадкаў захворвання на пранцы за 2009 год склала 18 на 100 тысяч насельніцтва.

Найболей выпадкаў гэтай хваробы зафіксавана ў Віцебскай і Гомельскай абласцях (29,8 і 27,6 на 100 тысяч насельніцтва). Ірына Шыманская зазначыла, што гэтыя лічбы непасрэдна звязаны з міграцыяй на працу ў Расію і іншыя краіны.

Акрамя мігрантаў, дальнабойшчыкаў, зняволеных, «працоўных» сэкс-індустрыі, у групу рызыкі трапляюць таксама маладыя людзі ад 18 да 25 гадоў. Асабліва калі маюць трох і больш сэксуальных партнёраў на год. Таму малодым трэба ўважліва сачыць за здароўем і не ленавацца праходзіць абследаванне як мінімум раз на год.

Агульная колькасць зарэгістраваных інфекцый рэпрадукцыйнага тракту ў 2009 годзе склала амаль 150 тыс. выпадкаў, ці 1 576 на 100 тысяч насельніцтва. Трэба заўважыць, статыстыка ўлічвае толькі выпадкі, зарэгістраваныя дзяржаўнымі ўстановамі.

Хворыя, якія праходзяць курс лячэння ў камерцыйных медыцынскіх цэнтрах, статыстыкай Мінздароўя пакуль не ўлічваюцца.

**Настасся Шамрэй**

КАЛЯНДАР

# У каталікоў пачаўся Вялікі пост

17 лютага, у Папяльцовую сераду, у Касцёле распачаўся 40-дзённы Вялікі пост. У Папяльцовую сераду на імшы пасыпаюць галовы попелам у знак пакаяння. Перажыванне Вялікага посту — гэта малітва, пост і міласціна.

«Вялікі пост — гэта час навяртання, — адзначае Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч у сваім пасланні на Вялікі пост. — Касцёл заклікае ўважліва паглядзець на сябе, каб лепш разглядзець наш унутраны свет, у якім увесь час адбываецца барацьба паміж дабром і злом».

Пост мае на ўвазе не толькі цялесныя адрачэнні (умеркаванасць у ежы, адмаўленне ад шкодных звычак, устрыманне ад удзелу ў забавах), але найперш працу над сабой і ўласнымі недахопамі.

**Сяргей Мікулевіч**

# Газетка дзеткам



КАЛЫХАНКА

Знікла сонейка і ўраз
Яснавокі дзень пагас.
Па сцяжынцы і наўзбоч
За пагоркам крочыць ноч.

А пад падушкай сон прылёг на бачок.
Баю-бай, дачушка, баю-баю, сынок.

Па-над рэчкай дрэмле бор
У чаканні першых зор.
Гасне позняя зара,
Нам з табою спаць пара.

А пад падушкай сон прылёг на бачок.
Баю-бай, дачушка, баю-баю, сынок.

**Словы Леаніда Пранчака, пакладзены на музыку Леанідам Захлеўным**

КЕМІКІ

**Злы чараўнік падмяніў адну літару. Вярні правільную літару, і выйдзе...**

тачка — птушка, якая плавае па вадзе

пень — бывае толькі ў сонечнае надвор'е

газа — у яе ставяць кветкі

кут — варкот

**Склала Валянціна Карнялюк**

**А зараз назаві правільныя літары.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**


PHOTOBYMEDIA.NET

**Таўшчыня снегавога покрыва ў многіх раёнах Беларусі ў лютым дасягнула 40 см. Ад пачатку зімы ў Мінску налічваецца 29 дзён з сярэднясутачнай тэмпературай мінус 10 і ніжэйшай. Столькі марозных дзён запар у Беларусі апошні раз назіралі 15 гадоў таму.**



**Смерць грузінскага саначніка на трасе ў Уістлеры (Ванкувер) была першым званком. Алімпійская траса аказалася няўдала спраектаванай і надзвычай рызыкоўнай. Падчас спаборніцтваў бабслеістаў перавярнуліся бобы экіпажаў з Ліхтэнштэйна, Аўстраліі, Вялікай Брытаніі і Канады. Спартоўцы нацярпеліся страху. Сяго-таго з іх пашкамутала. На фота: так выглядала спіна пілота брытанскай двойкі Джона Джэксана пасля здарэння.**



**Зарабіць грошай на Алімпіядзе імкнуцца ўсе. Цёмны бок Алімпіяд — старонка 7.**



СЯМЁН ПЕЧАНКО

**На этыкетцы гарэлкі «Богатырская» ад «Мінск Крышталь» намаляваныя былінныя волаты. Але ўзнікаюць два пытанні. З якой пары асілкі ездзяць пад чырвона-зялёным сцягам? І дзе падзеўся трэці?**



фота Людмілы Пракопавай

**Раз ёсць лядовы палац, трэба яго выкарыстоўваць. Крэатыўны ход баранавіцкага ЗАГСа: шлюб на каньках. Каштавала задавальненне 1,5 млн рублёў.**

**Адказы да старонкі 15:** качка, цень, ваза, кот.

## АНЕКДОТЫ

* * *

З усяго прагнозу сіноптыкаў супала толькі «заўтра чакаецца...».

* * *

Як толькі жонка сядала іграць на піяніна, сабака пачынаў ёй падвываць. Урэшце мужу гэта надакучыла:

— Калі ласка, — узмаліўся ён, — сыграй штосьці такое, чаго наш сабака яшчэ не ведае.

* * *

Жыццё дачніка — гэта пастаянная барацьба. З суседскімі дзецьмі, якія лічаць яго гарод сваім, і са сваімі дзецьмі, якія лічаць яго чужым.

* * *

Па статыстыцы, самая папулярная мужчынская смс-ка — «Я цябе таксама».

* * *

Алімпійская заканамернасць: колькасць медалёў у краіны зваротна прапарцыйная шырыні твараў чыноўнікаў Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

* * *

На пляжы дэльфін выратаваў чалавека, пераканаўшы яго не купляць чабурэк.

* * *

Сапраўдны студэнт — гэта не той чалавек, які спрабуе ўспомніць, які сёння экзамен, а той, які спрабуе даведацца ў аднагрупнікаў, які экзамен ён сёння здаў.

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**У нашым Гродне ўсё модне**

На Саборнай, напрыклад, вуліцы то столькі таўчэцца заўсёды народу, не маючы, відаць, нічога лепшага да работы, што калі патрэба здарыцца прайсці, то і людзям, і сабе паадбіваеш бакі.

**П.Аляксюк**

**«НН». №8. 1910**

**Абакралі Папова на 40 тысяч**

Галоўны трэнер беларускай біятлоннай зборнай Аляксандр Папоў кіраваў у аэрапорт, каб вылецець у Нарвегію, дзе беларусы 19-га меліся ўзяць старт у чэмпіянаце свету. Выпраўляўся сп.Папоў не з пустымі рукамі — вёз на патрэбы каманды 40 000 даляраў, атрыманых у Міністэрстве спорту й турызму. Аднак гэтага трэнеру падалося малавата, дык ён вырашыў заскочыць у сувенірны аддзел ЦУМа. Торбачку з грашыма коўч не пакінуў у машыне, а захапіў з сабой у краму... Пра тое, што адбылося ў ЦУМе, мала каму вядома. Але кругленькая сума знікла. Шакаваны Папоў адразу ж пасля выяўлення прапажы падаў заяву ў Першамайскі РУУС. Тут жа гора-скарбніка арыштавалі, але неўзабаве адпусцілі.

**«НН». №8. 2000**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6315.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 23.02.2010.
Замова № 906.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614